Беларуская Грэка-Каталіцкая (Уніяцкая) Царква
сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла ў Лёндане

ВЫБРАНЫЯ СЛУЖБЫ З МІНЭІ

# СТУДЗЕНЬ

Частка 3

Лёндан 2004

## 16 студзеня

# ПАКЛАНЕНЬНЕ ПУТАМ СЬВЯТОГА АПОСТАЛА ПЯТРА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*). Зьвязаны за Госпада і пасаджаны у вязьніцу, ты, апостале, зьвязаў усе спакусы. З любоўю і вераю цалуем путы твае, ад якіх атрымліваем здароўе цялеснае і збаўленьне душы, і славім цябе як найвышэйшага апостала і суразмоўцу анёлаў. (*Двойчы*)

Праз цябе першага многія народы, апанаваныя нярозумам, атрымалі разуменьне Праўды, бо табе быў паказаны посуд, поўны ўсялякіх жывёлаў, што зыходзіў з вышыні. Таму ўсякі род славіць цябе і пакланяецца путам, якія ты насіў за Хрыста. (*Двойчы*)

Ты, апостале, уславіў уваскрослага Хрыста, — якога ты раней выракся, калі той быў пад судом, — і прапаведаваў Яго па ўсёй зямлі як Бога і Чалавека, што ў вялікай дабрыні сваёй стаўся саўдзельнікам нашай прыроды. Таму з любоўю славім цябе і пакланяемся путам, якія ты, слаўны, насіў за Хрыста. (*Двойчы*)

Слава...

(*Тон 6*). Сёньня аснова Царквы, камень веры Пётра паказвае нам свае пачэсныя путы для нашага духоўнага аздараўленьня. Прыйдзеце ўсе, пацалуем іх і пахвальнымі песьнямі ўславім яго: Радуйся, шчыры барацьбіт за веру, які гарачым розумам сьмела вызнаў Хрыста як Сына Божага; Радуйся, радасьць сусьветная, нябеснага валадарства ключару, што даеш ласку тым, якія шануюць цябе і сьвятыя твае путы ў думках цалуюць. Стоячы перад пасадам Уладара ўсіх Хрыста, маліся за нас, якія спраўляем памяць тваю.

Цяпер...

*Дагматык (тон 6).* Хто Цябе не назаве шчасьліваю, Найсьвятая Дзева; хто ня будзе славіць, Чыстая, мацярынства Тваё? Адзінародны Сын, што спрадвеку зазьзяў ад Айца, ад Цябе, прыняўшы цела, у невыказны спосаб нарадзіўся. Праўдзівы Бог, Ён стаўся праўдзівым чалавекам дзеля нас, непадзельны на дзьве асобы, але ў дзьвюх нязьлітных прыродах пазнавальны. Малі Яго, Чыстая і Благаславёная, даць зьмілаваньне душам нашым.

**Чытаньне Першага лісту Сьвятога Апостала Пятра**

Браты, хай будзе блаславёны Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста. Ён, у вялікай міласэрнасьці сваёй, цераз уваскрасеньне з мёртвых Ісуса Хрыста, нанова нарадзіў нас да жывой надзеі, да спадчыны незьнішчальнай і чыстай, што ніколі не завяне, якая прызначаная для нас у небе. Сілаю Божаю праз веру вы захаваныя для збаўленьня, якое мае аб'явіцца ў апошні час. Дзеля гэтага цешцеся, хоць цяпер вам і прыходзіцца зазнаць суму з прычыны розных выпрабаваньняў. Цераз гэта вартасьць веры вашай станецца больш каштоўнай за золата — якое, хоць і выпрабоўваецца агнём, але падуладнае зьнішчэньню, — на славу і хвалу ў аб'яўленьні Ісуса Хрыста. Вы, ня бачыўшы, любіце Яго; і верыце ў Яго, хоць ня бачыце, а будзеце цешыцца радасьцю вялікай і поўнай хвалы, калі асягнеце мэту вашай веры — збаўленьне душаў. *(1, 1:3-9)*

**Чытаньне Першага лісту Сьвятога Апостала Пятра**

Мілыя мае, падперазаўшы паясьніцы розуму вашага, будзьце цьвярозымі, мейце дасканалую надзею на ласку, якая будзе вашым удзелам у аб'яўленьні Ісуса Хрыста. Як паслушныя дзеткі, не кіруйцеся вашымі ранейшымі пажаданьнямі, калі вы былі яшчэ несьвядомымі, але усім вашым паступаньнем станьцеся сьвятымі на прыклад Сьвятога, які вас паклікаў; бо напісана: "Будзьце сьвятымі, бо Я сьвяты." Бо калі вы называеце Айцом Таго, які судзіць кожнага паводле ўчынкаў яго, не ўзіраючыся на аблічча, дык у страху праводзьце час прабываньня вашага тут на чужыне. Вы ведаеце, што вы былі выкупленыя ад вашых благіх звычаяў, атрыманых у спадчыну ад продкаў вашых, не недаўгавечным срэбрам ці золатам, але бясцэннаю крывёю Хрыста, быццам беззаганнага і чыстага Ягняці. *(1:13-19)*

**Чытаньне другога лісту Сьвятога Апостала Пятра**

Браты, старайцеся ўзмоцніць ваша пакліканьне і выбар. Так робячы, ніколі не ўпадзеце. У такі спосаб будзе вам шырока адчынены ўваход да вечнага валадарства Госпада нашага і Збаўцы Ісуса Хрыста. Вось чаму буду заўсёды нагадваць вам пра гэта, хоць вы гэта знаеце і ўмацаваныя ў гэтай праўдзе. Лічу слушным, пакуль я ў гэтым целе, абуджаць вашую памяць, бо ведаю, што неўзабаве мне прыйдзецца пакінуць цела маё, як Госпад наш Ісус Хрыстос мне аб'явіў. Буду намагацца, каб вы, нават пасьля таго, як я адыду, мелі заўсёды ў памяці гэтыя рэчы. Бо мы не ішлі за казкамі і выдумкамі, калі аб'явілі вам магутнасьць і прыйсьце Госпада нашага Ісуса Хрыста, але навучалі, як сьведкі Ягонай велічы. Бо Ён прыняў ад Бога Айца

гонар і хвалу, калі прыйшоў вось такі голас да Яго ад Велічнай Славы: "Гэта Сын Мой любы, Яго Я ўспадабаў." І мы чулі, як гэты голас прыйшоў з неба, калі мы былі з Ім на сьвятой гары. Маем і мацнейшае, прароцкае, слова. Вы добра робіце, што трываеце пры ім, як пры сьветачы, што сьвеціць у цёмным месцы, аж пакуль не пачне днець, і раньняя зорка ня ўзыдзе ў вашых сэрцах. (*1:10-19*)

**Ліцьця**

(*Тон 4*). Сам Госпад назваў цябе шчасьлівым і даў табе ключы валадарства свайго. Дзеля гэтага мы, верныя, славім цябе, апостале Пётра, і пакланяемся пачэсным путам тваім, якія ты насіў за Хрыста.

"Зьвяжуць цябе і павядуць, куды ня хочаш ісьці" — Госпад прадказаў табе, Пётра, і загадаў ісьці сьледам за Ім. І ты, распалены любоўю, пайшоў за Ім, не збаяўшыся путаў і крыжа, што чакалі цябе.

Ты поўны славы і сьвятасьці, годны подзіву апостале Пётра. З вераю прымаем словы твайго навучаньня, і пакланяемся боскім путам тваім, якімі ты запячатаў тваю бязьмежную любоў да Госпада, за якога ты паказаў гатоўнасьць памерці.

Слава...

(*Тон 5*). Камень царкоўны, Пятра ўсяхвальнага ўславім, верныя, і паклонімся ягоным пачэсным путам. Ён прасьвятліў увесь сьвет сваім навучаньнем, і даў нам прыклад сапраўднага каяньня і любові да Госпада.

Цапер...

Баслаўляем Цябе, Багародзіца Дзева, мы верныя, і дастойна славім Цябе, як непахісную сьцяну, надзейную заступніцу і прыстанішча душаў нашых.

**Вершапесьні**

(*Тон 4*). Як найвышэйшага сярод апосталаў і ключара валадарства нябеснага, славім з вераю цябе, апостале Пётра, і цалуем путы, якія ты, быццам злачынца, насіў, каб разьбіць злачынныя намеры ворага. Маліся, каб нам выбавіцца ад ягоных сецяў.

*Верш.* Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

Калі Збаўца спытаўся ў вучняў сваіх: "За каго лічаць Мяне людзі?", ты, Пётра, найвышэйшы з апосталаў, сьмела адказаў: "Ты — Хрыстос, Сын Бога жывога." Дзеля гэтага славім цябе, бо ты атрымаў з неба адкрыцьцё і ўладу вязаць і разьвязваць.

*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

*(тон 8).* Пакінуўшы лоўлю рыбаў, ты атрымаў з неба ад Айца Боскае адкрыцьцё уцелаўленьня Слова і сьмела ўсклікнуў з вераю Творцы твайму: "Ведаю Цябе, як адзінасутнага Сына Божага." Дзеля гэтага ты, Пётра апостале, слушна быў названы Каменем веры і Ключаром ласкі. Малі Хрыста Бога даць адпушчэньне грахоў тым, што славяць цябе і з любоўю цалуюць пачэсныя путы твае.

Слава ...

*(Тон 6).* Пётра, камень веры, паказвае нам сёньня, як вялікі скарб, свае путы для ацаленьня немачаў, пацяшэньня сумных, і дапамогі для ўсіх у патрэбе. Дык прыйдзіце ўсе, будзем маліць Таго, хто праславіў яго: "Малітвамі Пятра, Хрысьце, збаў душы нашыя."

Цяпер...

*Багародзічны.* Творца і Збаўца мой, Усячыстая, Госпад Хрыстос выйшаў з улоньня Твайго, у мяне апрануўся і ад першага Адамавага праклёну вызваліў. Дзеля гэтага Табе, Багародзіца, як Маці Божай і Дзеве, разам з анёламі нязмоўкна ўсклікаем: "Радуйся!." Радуйся, Уладарка, Заступніца, Абарона і Збаўленьне душаў нашых!

**Адпушчальныя трапары**

**1. Калі ёсьць ліцьця і благаславеньне хлябоў:**

***Трапар Пятра*** *(тон 4)*: Рыму не пакінуўшы, ты наведаў нас путамі, якія ты, першы сярод апосталаў, насіў за Хрыста. Пакланяемся ім з вераю і молімся, каб Бог малітвамі тваімі дараваў нам багацьце свайго зьмілаваньня. (*Двойчы*)

Багародзіца Дзева, радуйся, поўная ласкі, Госпад з Табою. Блаславёная Ты між жанчынаў, і блаславёны Плод улоньня Твайго, бо Ты нарадзіла Збавіцеля душаў нашых.

**2. Калі няма ліцьці:**

***Трапар Пятра*** *(тон 4)*: Рыму не пакінуўшы...

Слава... цяпер...

***Багародзічны***: Тайна спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і, пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, уваскрасіў ім першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

## ЮТРАНЬ

**Пасьля "Госпад — Бог..."**: *трапары як уканцы вячэрні.*

**Сядальная песьня 1** (*тон 4*). "Я Пастыр добры, — кажа Госпад Ісус, — душу маю кладу за авечак маіх. Калі любіш мяне, Пётра, больш чым яны, пасі авечак Маіх, пасі ягнятаў Маіх." Падвойны запавет любові прыняў ты, апостале Пётра, ад Начальніка пастыраў, за якім ты пайшоў, не збаяўшыся мукаў, якія ты пацярпеў за Яго.

Слава... цяпер...: Надзея непахісная тых, што спадзяюцца на Цябе, адзіная, што нарадзіла звышпрыродна Хрыста Бога нашага, разам з апосталамі малі Яго даць сьвету ачышчэньне правінаў, і усім нам перш, як прыйдзе канец, направу жыцьця.

**Сядальная песьня 2** (*тон 4*). Ты быў схоплены сьвятарамі і старшынямі габрэйскімі, пабіты і ўкінуты ў вязьніцу разам з Хрысталюбым Янам; табе забаранілі ўспамінаць імя Ісуса і навучаць верыць у Яго. Ты ж, блаславёны Пётра апостале, узброіўшыся ў непахісную веру, перад іхнім зборышчам, быццам каменем з прашчы, прароцкімі словамі абвясьціў Госпада Ісуса; і адышоў ад іх, з радасьцю пацярпеўшы за Ісуса раны і насьмешкі.

Слава... Цяпер...: Надзейную Заступніцу тых, што ў бедах, нашую Памочніцу і Хадайніцу перад Богам, дзякуючы якой мы вызваліліся ад тленнасьці, Багародзіцу верна ўславім.

**Паліелей**: Хваліце імя Гасподняе...

**Узьвялічваньне**: Узьвялічваем цябе, апостале Хрыстовы Пётра, і з любоўю цалуем пачэсныя путы твае, якія ты насіў за Хрыста.

*Верш 1.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

*Верш 2.* Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

*Верш 3.* Ад усходу сонца да захаду хай будзе праслаўленае імя Гасподняе.

*Верш 4.* Госпад сілу людзям сваім дае, Госпад баслаўляе людзей сваіх супакоем.

Слава... цяпер...

Алілуя, алілуя, алілуя. Слава Табе, Божа. (*Тройчы*)

**Сядальная песьня** *(тон 8).* Ірад вызьверыўся і ўзьняў руку на цябе, пахвалы годны апостале Пётра. Схапіўшы, ён загадаў трымаць цябе закаванага ў вязьніцы пад строгаю вартаю, пакуль міне пасха габрэйская, каб тады аддаць цябе на сьмерць. Але яшчэ не настаў час і месца мукаў тваіх. Таму анёл прыйшоў да цябе і загадаў рыхтавацца ў дарогу і, правёўшы цябе праз моцныя замкі, зьнікнуў. Ты ж, пазнаўшы, што збаўленьне прыйшло ад Бога, аддаў славу Яму.

Слава ... цяпер...

*(Тон 8).* Беззаганная Нявеста Творцы, Маці Збавіцеля, што мужа ня знала, усяхвальная скарбніца Пацяшыцеля, спяшайся выбаваліць мяне, агіднае жыльлё беззаконьня, чый розум стаўся пацехаю для бесаў, і зрабі мяне сьветлым жыльлём дабрадзейнасьцяў і нятленных багацьцяў. Малітвамі Тваімі адгані ад мяне хмару пажадлівасьцяў, і ўчыні годным незаходнага сьвятла і ўдзелу ў вышэйшым жыцьці.

**Узыходная песьня:** *першы антыфан 4 тону.*

**Пракімен.** Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і а аж да канцоў сьвету словы іх.

*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

**Чытаньне сьвятога Евангельля паводле Яна**

Сказаў Госпад да габрэяў, якія прыйшлі да Яго: "Словы, якія кажу вам, ёсьць Дух і жыцьцё. Але ёсьць сярод вас такія, што ня вераць." Бо ведаў Ісус ад пачатку, хто ня верыць і хто прадасьць Яго. І таму сказаў: "Ніхто ня можа прыйсьці да Мяне, калі гэта ня будзе яму дадзенае ад Айца Майго." З таго часу многія з Ягоных вучняў адышлі ад Яго і ўжо больш не хадзілі з Ім. Тады Ісус сказаў дванаццацём: "Ці ня хочаце і вы адысьці?" Сыман Пётра адказаў Яму: "Госпадзе! Да каго мы пойдзем? Ты ж маеш словы жыцьця вечнага. І мы пазналі і ўверылі, што Ты — Хрыстос, Сын Бога жывога." (*Ян 8;63-69*)

**Пасьля Пс 50:**

Слава...: Малітвамі сьвятога апостала Пятра, Міласэрны, ачысьці мноства правінаў нашых.

Цяпер...: Малітвамі Багародзіцы, Міласэрны, ачысьці мноства правінаў нашых.

Зьмілуйся нада мною, Божа...: (*Тон 6*). Першы апостале Пётра, верны ключар Хрыстовы, пастыр пастыраў, прыклад каяньня для грэшнікаў, поўны любові да Ісуса, камень Царквы Божае, непераможны мучанік, малі Хрыста Бога даць нам адпушчэньне грахоў.

**Канон**
(Тон 4)

***Песьня 1.*** *Ірмас.* Людзі ізраільскія сухімі нагамі мокрую глыбіню Чырвонага Мора перайшлі; убачыўшы, як вершнікі і калясьніцы ворагаў патанулі, яны радасна запяялі: "Пяем Богу нашаму, бо Ён уславіўся"

Уся Царква Хрыстовая сьвяткуе ў духу, добраславіць з вераю і цалуе твае, апостале, пачэсныя путы, якімі ты дзеля любові быў зьвязаны, сам зьвязаўшы мучыцеля.

З глыбіні спакусы ты, Пётра, выцягваў людзей як рыбы, і прыводзіў іх да Таго, хто паклікаў цябе ад рыбацтва і паставіў найвышэйшым апосталам. Дзеля гэтага цалуем путы, якія ты насіў.

Ты, Пётра, умацаваў вераю душы верных, разбурыў ідальскія сьвятыні і збудаваў цэрквы, дзе заўсёды шануюць цябе і твае путы.

Слава... цяпер...: Зброя хітрага ворага саслабла, калі была прабітая кап'ём Слова, што пасялілася ў чыстым улоньні Тваім, Багародзіца Дзева. Малю Цябе, дай, каб сэрца маё было параненае жаданьнем Яго.

*Катавасія.* Сонечныя промні калісьці асьвятлілі зямлю, што была ў глыбіні марской: бо вада па двух бакох сталася быццам сьцяна, а людзі перайшлі мора пехатою, сьпяваючы Богапрыемную песьню: "Пяём Госпаду, бо Ён уславіўся!"

***Песьня 3.*** *Ірмас.* Лук сільнага саслаб, а немачны апяразаўся сілаю. Дзеля гэ тага маё сэрца ўмацавалася ў Госпадзе.

Прасветлены чыстым Боскім Сьвятлом, ты, Пётра, стаўся другім сьвятлом, што прасьвятляе нашыя душы.

Ты, найвышэйшы апостале, непарушная аснова догмаў, умацаваў законы Хрыстовыя і беззаконных добрых нораваў навучыў.

Ты, Пётра, прапаведаваў Бога, які цярпеў за нас і быў расьпяты на крыжы. Дзеля гэтага шануем путы, якія ты насіў за Яго.

Слава... цяпер...: Сьмерць устрымала сваё няўстрымнае імкненьне да Цябе, бо Ты нарадзіла Крыніцу несьмяротнасьці, Багародзіца Маці Дзева.

*Катавасія* Ты, Госпадзе, — умацаваньне тых, што спадзяюцца на Цябе. Умацуй Царкву Тваю, якую Ты набыў крывёю сваёю.

**Сядальная песьня.** *(Тон 4)* Хвалім цябе, апостале Пётра, як найвышэйшага сярод мудрых апосталаў і ключара нябеснага валадарства, і цалуем з чыстым сумленьнем путы твае, якія ты насіў, быццам злачынца. Ты, што суцішаеш закалоты варожыя, дай і нам выбавіцца ад іх малітвамі тваімі.

Слава... цяпер...: Ты, Усячыстая, —вышэйшая за хэрувімаў і сэрафімаў, больш прасторная за неба і зямлю, больш пачэсная за ўсе стварэньні бачныя і нябачныя, бо Ты зьмясціла ва ўлоньні сваім Таго, каго неба зьмясьціць ня можа. Малі Яго за збаўленьне слугаў Тваіх.

***Песьня 4.*** *Ірмас.* Дзеля любові да створанага Табою на вобраз Твой, Ты ўзышоў на крыж. Чалавекалюбны Госпадзе, Ты — мая сіла і пахвала.

Ты, найвышэйшы апостале, аснова веры, прапаведаваў веліч Уладара і прывёў да боскай веры непакорлівых людзей.

Тваё хаджэньне па водах, Пётра, было выклікана любоўю да Таго, хто хадзіў па іх і паказаў табе Боскія сьцежкі.

Путы, якія ты, блаславёны Пётра, насіў, — лекі ад многіх немачаў. Таму цалуем іх з пашанаю.

Слава... цяпер...: Уладар усіх пасяліўся ў Тваім улоньні быццам у хораме, і прыняў цела ад Цябе, Беззаганная Дзева.

*Катавасія.* Ласка Твая, Хрысьце, пакрыла нябёсы. Выйшаўшы з каўчэга сьвятасьці — Твае ўсячыстае Маці, — Ты явіўся як Дзіця

на руках у сьвятыні славы Тваёй, і ўвесь сьвет напоўніўся хвалой Тваёй.

**Песьня 5.** *Ірмас.* Пашлі нам, добры Госпадзе, прасьвятленьне Тваё, туман правінаў нашых разгані і дай нам Твой супакой.

Боскім адкрыцьцём ты, усяхвальны, вызнаў беспачатнага з Айцом Сына, і за гэта сам Госпад назваў цябе шчасьлівым.

Калі ты, Пётра, убачыў на гары Табор сьвятло, ясьнейшае за сонца, ты быў прасьветлены існым Сьвятлом ад Сьвятла, і верных прасьвятліў.

Ты, Пётра, прапаведаваў мёртвага трохдзённага Хрыста, дзеля якога ты насіў путы. Мы пакланяемся ім і набожна шануем цябе.

Слава... цяпер...: Ацяжэлага бярэмям шматлікіх грахоў, аблягчы мяне, Усячыстая, каб мне насіць лягчэйшае іга Хрыстовае.

*Катавасія.* Ісая ўбачыў вобразна на пасадзе Бога, якога ўзносілі ў славе хэрувімы, і ўсклікнуў: "Гора мне, бо я бачыў перадчасна Бога, які мае прыйсьці ў целе, Госпада незаходнага Сьвятла і Ўладара сьвету!"

**Песьня 6.** *Ірмас.* Прарок Ёна явіў вобраз трохдзённага ўваскрасеньня, калі ў нутры кіта маліўся: "Ад тленнасьці вызвалі мяне, Ісусе, Уладару сілаў."

Ты пацярпеў укрыжаваньне ўніз галавой, і накіраваў ногі твае на шлях, што вядзе да неба. Умацуй і нас, вучню Хрыстовы, заўсёды хадзіць па ім.

Калі ты быў зьвязаны дзеля непрамінальнага жыцьця, ты путы ворага, які зьвязаў цябе, разарваў. Дзеля гэтага шануем цябе.

Малі, блаславёны, Уладара ўсяго стварэньня, каб Ён паслаў ачышчэньне, супакой і зьмілаваньне ўсім, што славяць цябе, бо ты Ягоны любы вучань.

Слава... цяпер...: Праайцец Адам скінуў скураную вопратку мёртвасьці, калі Творца апрануўся ў яе, узяўшы невыказна цела ад Цябе, Усебеззаганная.

*Катавасія.* Стары Сямён убачыў на ўласныя вочы Збаўленьне, што прыходзіць ад Бога да людзей, і ўсклікнуў: "Ты, Хрысьце, — Бог мой!"

**Кандак** *(тон 2):* Вярхоўнага і першага сярод апосталаў, Богам натхнёнага пасьлядоўніка праўды, Пятра вялікага ўсхвалім і з вераю цалуем путы ягоныя, просячы адпушчэньня правінаў.

*Ікас.* Які язык можа належна ўсхваліць слаўнага і вялікага вучня Гасподняга? Які розум уславіць таго, каго Боскае Слова ушанавала ласкаю сваёю? Тым ня менш асьмелваюся ўзяцца за непасільную справу. Дык хадзеце, сьвяталюбцы, пабожна ўсхвалім у песьнях першапасаднага, просячы адпушчэньня правінаў.

**Песьня 7.** *Ірмас.* Юнакі Абрагамавы некалі ў Бабілёне полымя ў печы за нішто палічылі і ўсклікнулі: "Айцоў нашых Божа, блаславёны Ты!"

Як вязень Хрыстовы, ты дасьведчыў путаў. Дзеля гэтага, Пётра, мы з вераю пакланяемся ім, бо яны разьвязваюць нашыя жарсьці.

Як сьведка Хрыстовы, ты, Пётра, апосталаў слава, абышоў, быццам сонца, увесь сьвет і разагнаў цёмную ноч мнагабожжа.

Ты жыў на славу Хрысту, Пётра слаўны, і даказаў гэта сваімі пакутамі. Дзеля гэтага славім цябе, і пакланяемся путам, якімі ты быў зьвязаны.

Слава.. цяпер...: Той, хто зышоў на зямлю, быццам дождж, напаіў богаразуменьнем увесь сьвет, і паказаў Цябе , Усячыстая, больш пачэснаю за анёлаў.

*Катавасія.* Цябе, які паслаў расу юнаком, што ў печы бласлаўлялі Цябе, і пасяліўся ў дзявочым улоньні, Бога-Слова, славім і набожна пяём: "Блаславёны Бог айцоў нашых!"

**Песьня 8.** *Ірмас.* Ты, усемагутны Збавіцелю ўсіх, паслаў расу пабожным юнаком сярод полымя, і навучыў іх пяяць: "Усе стварэньні, блаславіце і ўзьвялічвайце Госпада."

Ты, Пётра, зьмякчаў жорсткія сэрцы і рабіў іх добрап лоднымі для Творцы ўсяго стварэньня, які даручыў табе боскія ключы вязаць і адпушчаць правіны.

Непахісны камень веры, Пётра блаславёны, ахоўвай поўню Царквы, адганяй ад верных спакусы, выпрасі для іх згоду і супакой.

Ты сьмела прапаведаваў Таго, хто пакутамі сваімі зьвязаў пекла. Дзеля гэтага, блаславёны Пётра, цалуем путы твае і імі ачышчаемся.

Славім Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, Бога.

Як анёлы нябесныя, ускліknem тройчы сьвятымі галасамі і ўславім першапрычыну ўсяго, — Айца, і Сына, і Духа, адзінае Боства, адзіную сілу, адзінае дзеяньне.

Цяпер...: Прарок бачыў цябе, Багародзіца, як духоўны сьвечнік, што носіць Боскую сьвечку, што прасьвятляе азмрочаных многімі правінамі.

*Катавасія.* Багабойныя юнакі стаялі непашкоджаныя сярод нясьцерпнага агню і пялі Боскую песьню: "Блаславіце Госпада, усе творы Гасподнія, і ўзьвялічвайце Яго праз усе вякі!"

**Песьня 9.** *Ірмас.* Сынараджэньне Тваё было нятленным. Бог з улоньня Твайго прыйшоў і явіўся ў целе на зямлі, і пажыў з людзьмі. Дзеля гэтага, Багародзіца, узьвялічваем Цябе.

Ты ўдастоіўся бачыць тое, што мае быць,, і прыняў узнагароду за подзьвігі твае ад Бога Чалавекалюбца, чые пакуты ты паўтарыў у целе тваім.

Ты быў разам з Сынам на гары Табор, і там ўдастоіўся чуць голас Айца, які сьведчыў аб Ім. Сэрца тваё, Пётра, ачышчанае Боскім Духам , слаўна зазьзяла.

Будзь, Пётра, ачышчэньнем для нас, якія з любоўю шануем цябе і путы твае цалуем, і выпрасі адпушчэнне правінаў і асалоду нябеснага валадарства.

Слава... цяпер...: Ты, усячыстая Дзева Маці, — жыльлё Сьвятла, дык настаў Сьвятлом мяне, пацямнелага ад варожых спакусаў, каб мне з вераю ўзьвялічваць Цябе.

*Катавасія.* Пад покрывам Закону і Пісаньняў вобраз нам, верным, дадзены: кожны сын першародны Богу пасьвячаецца. Дзеля гэтага мы ўзьвялічваем Першароднае Слова спрадвечнага Бога, Сына першароднага Дзевы Маці.

Экзапастыляр (сьвяцільнік). Путамі грэшных пажаданьняў зьвязанага, мяне, няшчаснага, разьвяжы, галава апосталаў, блаславёны Пётра, як табе некалі разьвязаў путы анёл Божы і вывеў з вязьніцы, дзе ты быў зачынены.

Слава.. цяпер...: Дзева беззаганная, Ты сталася Маці, калі Ты нарадзіла надпрыродна Бога і Чалавека. Тваё сынараджэньне было збаўленьнем для тых, што пяюць: "Слава, пашана і пакланеньне належыцца Тройцы недасяжнай і Боскай."

**Пахвальныя псалмы**

(*Тон 4*). Ты, Пётра слаўны, тройчы выракся Хрыста, але Ён патройным запытаньнем ацаліў тваю віну і явіў цябе ўмацаваньнем многіх, што пахіснуліся.

Боскі ключар Пётра, адчыні уваход у валадарства для тых, што на зямлі з вераю шануюць цябе і цалуюць твае пачэсныя путы, якімі ты быў зьвязаны.

Бласлаўляем цябе, найвышэйшы Пётра апостале, і цалуем путы твае, якія ты насіў, быццам злачынца, і якімі зьвязаў князя цемры.

Хрыстос-Слова Божае, які зьявіўся ад Айца, спытаўся ў вучняў сваіх: "За каго Мяне лічыце?", "Ты — Сын Бога жывога" — ты, Пётра, адказаў за ўсіх. Тады Госпад сказаў: "Шчасьлівы ты, Пётра, сыне Ёны, ты атрымў узнагароду." Бо Бог, які праслаўляе тых, што славяць Яго, і кліча да ўдзелу ў Ягоных дабротах, паклаў цябе як непарушную скалу, на якой заснаваў і ўмацаваў Царкву сваю.

Слава...

(*Тон 4*). Патройным запытаньнем: "Пётра, ці любіш Мяне?", Хрыстос выправіў патройнае тваё адрачэньне. Ты ж, Сымоне, усклікнуў да Таго, хто ведае тайны сэрцаў: "Госпадзе, Ты ўсё ведаеш, Ты ведаеш, што люблю Цябе!" Тады Збавіцель табе ў адказ: "Пасі авечак Маіх, пасі выбраных Маіх, пасі ягнятаў Маіх, якіх Я падрыхтаваў для збаўленьня." Дзеля гэтага, блаславёны апостале Божы, малі Яго цяпер, каб Ён дараваў нам багацьце свайго зьмілаваньня.

Цяпер...

Маючы Цябе, Багародзіца, нашай надзейнай Заступніцай, не баімся варожых подступаў, бо Ты збаўляеш душы нашыя.

*Пасьля Вялікага Услаўленьня:*

***Трапар Пятра*** *(тон 4)*: Рыму не пакінуўшы, ты наведаў нас путамі, якія ты, першы сярод апосталаў, насіў за Хрыста. Пакланяемся ім з верою і молімся, каб Бог малітвамі тваімі дараваў нам багацьце свайго зьмілаваньня.

***Багародзічны***: Тайна спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і, пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, уваскрасіў ім першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

## ЛІТУРГІЯ

**Трапар Пятра** *(тон 4)*: Рыму не пакінуўшы...( *Гл. вышэй*)

**Кандак** *(тон 2)*: Вярхоўнага і першага сярод апосталаў, Богам натхнёнага пасьлядоўніка праўды, Пятра вялікага ўсхвалім і верою цалуем путы яго, адпушчэньня правінаў просячы.

**Пракімен** *(Пс 18:5,2)*. Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.
*Верш*. Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

**Чытаньне Апостальскіх Дзеяньняў**

У той час цар Ірад падняў руку, каб мучыць некаторых з царквы. Ён забіў мячом Якуба, брата Яна. Убачыўшы, што гэта спадабалася габрэям, ён наважыўся ўзяць і Пятра. А былі дні праснакоў. Схапіўшы, ён пасадзіў яго ў вязьніцу і загадаў чатыром чацьвёркам жаўнераў сьцерагчы яго, намерваючыся пасьля Пасхі вывесьці яго да народу. Дык вось Пятра пільнавалі ў вязьніцы, а царква няспынна малілася за яго Богу. У ноч, калі Ірад меўся вывесьці яго, Пётра спаў між двух жаўнераў, скаваны двума ланцугамі, ды перад брамаю варта пільнавала вязьніцу. І вось зьявіўся анёл Гасподні, і сьвятло зазьзяла ў будынку. Штурхнуўшы Пятра ў бок, ён разбудзіў яго і сказаў: "Уставай хутчэй!" І зваліліся з рук ягоных ланцугі. А анёл сказаў яму: "Падпяражыся і надзень твае сандалі." А калі той зрабіў гэта, сказаў: "Накінь плашч твой і ідзі за мною." І, выйшаўшы, Пётра пайшоў за ім. І ня ведаў, ці праўда тое, што сталася праз анёла: яму здавалася, што бачыць прывід. Абмінуўшы першую варту і другую, яны падышлі да жалезнай брамы, што вяла да места, і яна сама сабой расчыніліся. Выйшаўшы, яны прайшлі адну вуліцу, і анёл зьнячэўку зьнік. Пётра, прыйшоўшы да сябе, сказаў: "Цяпер

ведаю сапраўды, што Госпад паслаў анёла свайго і выхапіў мяне з рукі Ірада і ўсяго, чаго чакаў народ габрэйскі." (*12: 1-11*)

**Алілуя** *(Пс 88:6,8)*. Нябёсы славяць цуды Твае, Госпадзе, і вернасьць Тваю — хоры сьвятых.

*Верш.* Бог праслаўлены ў мностве сьвятых.

**Чытаньне сьвятога Евангельля паводле Яна**

У той час зьявіўся Ісус вучням сваім, уваскросшы з мёртвых, і кажа Сымону Пятру: "Сымоне, сыне Ёны, ці любіш Мяне больш, чым яны?" Адказаў Яму: "Так, Госпадзе, Ты ведаеш, што люблю Цябе." Кажа яму: "Пасі ягнятаў Маіх." Зноў кажа яму другі раз: "Сымоне, сыне Ёны, ці любіш мяне?" Кажа Яму: "Так, Госпадзе, Ты ведаеш, што люблю Цябе." Кажа яму: "Пасі авечак Маіх." Кажа яму трэці раз: "Сымоне, сыне Ёны, ці любіш ты Мяне?" Засумаваў Пётра, што Ён сказаў яму трэці раз: "Ці любіш Мяне?." І сказаў Яму: "Госпадзе, Ты ўсё ведаеш, Ты ведаеш, што люблю Цябе." Кажа яму Ісус: "Пасі авечак Маіх. Сапраўды, сапраўды кажу табе: калі ты быў маладзейшы, дык падпярэзваўся сам і ішоў, куды хацеў; калі ж пастарэеш, працягнеш твае рукі, і іншы падпярэжа цябе і павядзе, куды ня хочаш." Гэта Ён сказаў, даючы зразумець, якой сьмерцю ён праславіць Бога. І, сказаўшы гэта, кажа яму: "Ідзі сьледам за Мною." Павярнуўшыся, Пётра ўбачыў, што за ім ідзе вучань, якога любіў Хрыстос, той самы, які на вячэры прыпаў да Ягоных грудзей і сказаў: "Госпадзе, хто прадасьць Цябе?" Дык, угледзеўшы яго, Пётра кажа Ісусу: "Госпадзе, а ён што?" Кажа яму Ісус: "Калі я хачу, каб ён застаўся, пакуль Я прыйду, што табе да гэтага? Ты ідзі за Мною." І разышлося гэтае слова сярод братоў, што вучань гэты не памрэ. Але Ісус не сказаў яму, што не памрэ, але: "Калі хачу, каб ён заставаўся, пакуль прыйду, што табе да гэтага?." Гэта і ёсьць той вучань, які сьведчыць пра гэта і напісаў гэта. І мы ведаем, што сьведчаньне ягонае праўдзівае. Ёсьць шмат іншага, што зрабіў Ісус: калі б пра ўсё гэта напісаць, дык думаю, што і ўвесь сьвет не зьмясьціў бы гэтых напісаных кнігаў. (*21:15-25*)

**Прычасьнік.** Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх. Алілуя, алілуя, алілуя.

## 17 студзеня

# СЬВЯТОГА АЙЦА НАШАГА АНТОНА ВЯЛІКАГА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*). Прасьветлены промнямі Духа, ты, ойча Антоне, загарэўся боскім жаданьнем і ўзьняў душу сваю да найвышэйшае існае любові; стараючыся зьяднацца з ёю, ты жыў быццам вонках гэтага сьвету, забыўшыся пра цела і кроў, і праводзячы час ва ўстрыманасьці і маўчаньні. Дзеля гэтага ты напоўніўся, як прасіў, вышэйшых дабротаў, і зазьзяў, быццам зорка, што прасьвятляе душы нашыя . (*Двойчы*)

Асьветлены боскім зьзяньнем, ты скрышыў лукі і стрэлы дэманаў ласкаю Боскага Духа, і сваімі вучэньнямі выкрыў іхнюю злосьць і хітрасьці. Ты быў ясным сьветачам для манахаў, красою пустыні, нямоглых выдатным і пачэсным лекарам і вобразам дабрадзейнага жыцьця, ойча Антоне. (*Двойчы*)

Чысты душою і сэрцам, зямны анёл, чалавек нябесны, настаўнік чысьціні, прыклад устрыманасьці, ты, Антоне, цяпер жывеш з тваім Уладаром і пяеш нязмоўкна хвалу Яму разам з анёламі, сьвятымі айцамі і мучанікамі. Ад лютых бедаў і правінаў ахоўвай тых, што спраўляюць сьвятую памяць тваю. (*Двойчы*)

Слава...

(*Тон 6*). Ты захаваў у сабе непашкоджаным вобраз Божы, узнёсшы розум да Уладара над згубнымі страсьцямі, каб разам з Ім узысьці на вышыню. Ты прымусіў сваю прыроду да паслушэнства, падапарадкаваў горшае лепшаму, і цела зрабіў слугою духа. Таму ты явіўся вяршыняю манахаў, грамадзянінам пустыні, добрым настаўнікам, вядомым правілам дабрадзейнасьцяў. І цяпер на нябёсах, не як у люстры, але сапраўды, ойча наш Антоне, бачыш Сьвятую Тройцу, і молішся за тых, што з вераю і любоўю шануюць цябе.

Цяпер...

Хто Цябе не назаве шчасьліваю, Найсьвятая Дзева, хто ня будзе славіць, Чыстая, мацярынства Тваё? Адзінародны Сын, што спрадвеку зазьзяў ад Айца, ад Цябе, прыняўшы цела, у невыказны спосаб нарадзіўся. Праўдзівы Бог, Ён стаўся праўдзівым чалавекам дзеля нас, непадзельны на дзьве асобы, але ў дзьвюх

нязьлітных прыродах пазнавальны. Малі Яго, Чыстая і Благаславёная, даць зьмілаваньне душам нашым.

**Чытаньне кнігі Мудрасьці**

Душы праведных у руцэ Бога, і мука не кране іх. Вачам неразумных здавалася, што яны памерлі, іхняе перастаўленьне ўважалася за няшчасьце, і адыход іх ад нас — за згубу; але яны прабываюць у супакоі. Бо, хоць паводле людзкога разуменьня іх сустрэла кара, надзея іх поўная несьмяротнасьці. Пацярпеўшы крыху, яны зазнаюць вялікіх дабрадзействаў. Бог іх дасьведчыў і знайшоў годнымі сабе. Ён іх выпрабаваў, як золата ў горне і прыняў іх, як цэлапальную ахвяру. У дзень іхняга наведаньня яны зазьзяюць і рассыплюцца, быццам іскры па іржышчы. Будуць судзіць плямёны і панаваць над народамі, і Госпад будзе ўладаром іхнім давеку. Тыя, што спадзяваліся на Яго, зразумеюць праўду, верныя ў любові будуць з Ім прабываць. Бо ласка і міласэрнасьць Ягоная для сьвятых Яго, і Ён наведае выбраных сваіх. *(3:1-10)*

**Чытаньне кнігі Мудрасьці**

Праведнікі вечна жыць будуць, і іхняя ўзнагарода ў Госпада, і Ўсявышні будзе клапаціцца пра іх. Дзеля гэтага яны атрымаюць карону славы і вянец красы з рукі Госпада. Ён іх пакрые правай рукою сваёй, і будзе ахоўваць іх плячом сваім. За зброю возьме зайздросную любоў сваю, і ўзброіць стварэньне на пакараньне ворагаў. Апранецца ў панцыр справядлівасьці, і шаломам ягоным будзе суд бесстаронні. За шчыт непераможны возьме сабе сьвятасьць, і навострыць, быццам меч, гнеў суровы. І разам з Ім увесь сьвет пойдзе на бой супраць бяздумных. Паляцяць з хмараў стрэлы маланак, паімчацца да мэты, быццам з нацягнутага луку; і пращчы будуць шпурляць град гневу. Воды марскія ўзбурацца супраць іх, і рэкі затопяць іх бязьлітасна. Уздымецца супраць іх дух Магутнасьці і, быццам бура, іх паразьвявае. Так беззаконьне спустошыць зямлю, а нікчэмнасьць разбурыць пасады моцных. Дык слухайце, уладары, і разумейце! Навучыцеся, судзьдзі ўсіх канцоў зямлі! Зважайце, начальнікі многіх, што хваліцеся вялікім лікам вашых падданых! Ад Госпада дадзеная вам улада, і сіла — ад Усявышняга. *(5:15-6:3)*

**Чытаньне кнігі Мудрасьці**

Праведнік, хоць бы і памёр заўчасна, знойдзе супакой. Старасьць ягоная пачэсная не даўгалецьцем, яна ня мерыцца лікам гадоў; сівізна ягоная — мудрасьць, а мера старасьці — жыцьцё беззаганнае. Ён быў даспадобы Богу, знайшоў міласьць у Яго і, жывучы сярод грэшнікаў, быў забраны, каб злосьць не сапса-

вала думкі ягонай, і няшчырасьць не зьвяла душы ягонай. Бо прывабнасьць злога засланяе добрае, і бура пажадлівасьцяў зацямняе правы розум. Дасягнуўшы рана дасканаласьці, ён шмат пераджыў, бо душа яго была мілая Богу, і таму Ён пасьпяшыў забраць яго з благога асяродзьдзя. А людзі бачылі гэта і не разумелі, і ня ўзялі сабе гэтага да сэрца, што міласэрнасьць і ласка Ягоная з выбранымі Ягонымі, і провід Ягоны са сьвятымі Яго. (*4:7-15*)

**Вершапесьні**

(*Тон 5*). Радуйся, ойча Антоне, што быў залічаны на вышынях да нябесных хораў: навучыўшыся дабрадзейнасьцяў, ты жыў на зямлі як анёл, явіўся чыстым і беззаганным люстрам, што зьзяе промнямі Духа Сьвятога. Навучаны і прасьветлены Боскім сьвятлом Хрыстовым, ты бачыў і прадказваў тое, што мела быць. Малі Яго цяпер даць душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Верш.* Дарагая перад Госпадам сьмерць сьвятых Яго.

Радуйся, посьнікаў правадыр і непераможны змагар: адсекшы карані страсьцяў і супрацівіўшыся нападам дэманаў, ты паказаў усім іхнюю слабасьць і душагубную хітрасьць, і явіў Крыжа Хрыстовага сілу. Падпярэзаўшыся ёю, ты перамог усіх, што адмаўлялі боскае прыйсьце ў целе Хрыста. Малі Яго даць зьмілаваньне душам нашым.

*Верш.* Шчаслівы муж, які баіцца Госпада і ў запаветах Ягоных знаходзіць суцяшэньне.

Сьветлы і непахісны стоўп дабрадзейнасьцяў, хмара, што ацяняе тых, што ў пустыні, ты быў настаўнікам тых, што ідуць ад зямлі да неба і да сузіраньня Бога. Крыжом ты, багаблаславёны, разьдзяліў мора страсьцяў, перамог духоўнага Амалека, знайшоў бесперашкодны шлях на неба і нятленнай спадчыны. Стоячы разам з анёламі перад пасадам Хрыста, малі Яго даць душам нашым веліч зьмілаваньня.

Слава...

(*Тон 8*). Шануем цябе, ойча Антоне, як духоўнага настаўніка, бо мы навучыліся ад цябе хадзіць па правым шляху. Шчаслівы ты, бо, паслужыўшы верна Хрысту, і разьбіўшы варожую сілу, ты стаўся суразмоўцам анёлаў і саўдзельнікам Паўла Тыбэйскага. Разам з імі маліся Госпаду, каб Ён дараваў душам нашым веліч зьмілаваньня.

Цяпер...

Чыстая Дзева, што Бога ў целе невыказна зачала, Маці Бога ўсявышняга, прымі маленьні слугаў Тваіх, Усячыстая, дай ачышчэньне ад правінаў і, выслухаўшы малітвы слугаў Тваіх, маліся за збаўленьне душаў нашых.

**Адпушчальныя трапары**

*(тон 4).* Рупліўца Ільлю ва ўсім пераймаючы і ўсьлед за Хрысьціцелем ідучы па правым шляху, ты быў жыхаром пустыні, Антоне, ойча наш, і малітвамі тваімі ўмацоўваў увесь сусьвет. Малі Хрыста Бога збавіць душы нашыя.

Слава... цяпер...: Тайна, спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая, праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, уваскрасіў ім першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

## ЛІТУРГІЯ

**Трапар** *(тон 4).* Рупліўца Ільлю ва ўсім пераймаючы...

**Кандак** *(тон 2).* Адкінуўшы клопаты сьвету, ты пражыў ціха жыцьцё, пераймаючы ва ўсім Хрысьціцеля. Дзеля гэтага шануем цябе разам з ім, блаславёны Антоне, айцоў сьвятых настаўніку.

**Пракімен** *(Пс 115:6:3).* Дарагая ў вачох Госпада сьмерць сьвятых Яго.
*Верш.* Чым адплачу Госпаду за ўсе дабрадзействы Яго.

**Апостал.** Гэб 13:17-21

**Алілуя** *(Пс 111:1,2).* Шчасьлівы муж, які баіцца Госпада і пацяшэньне знаходзіць у запаветах Яго.
*Верш.* Патомства яго будзе магутным на зямлі.

**Евангельле.** Лк 6:17-23а

**Прычасьнік.** Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не збаіцца.

## 18 студзеня

# МІЖ СЬВЯТЫМІ АЙЦОЎ НАШЫХ АПАНАСА І КІРЫЛЫ, АРЦЫБІСКУПАЎ АЛЕКСАНДРЫЙСКІХ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...:**

*Апанаса..* (*Тон 4*). Ты цярпеў перасьлед і вялікія цяжкасьці, пакуль не выкараніў ерась Арыя, і не абараніў статак твой ад нязбожнасьці, навучаючы праўдзіва, што Сын і Дух адзінасутныя з Айцом, сьятаначльніку благаславёны, ойча пачэсны Апанасе.

Бліскучым прапаведаваньнем ты, Апанасе, прасьвятліў тых, што ў цемры, і адагнаў спакусу; як сапраўдны пастыр, ты дбаў нястомна пра чысьціню веры і быў непарушным умацаваньнем сьвятое Царквы. Дзеля гэтага мы ўсе радасна ў песьнях ушаноўваем цябе.

Навучыўшыся з цярплівасьцю ўсялякай дабрадзейнасьці, ты, боганатхнёны Апанасе, атрымаў сьвятое памазаньне Духа і быў сьвятаначальнікам і сапраўдным пастырам, і змагаром за праўдзівую веру. Дзеля гэтага ўся Царква шануе памяць тваю, спраўляючы сьвята і праслаўляючы Збавіцеля.

*Кірылы.* Ты, Кірыла, жэзлам навучаньняў тваіх адагнаў ад Хрыстовае Царквы духоўных ваўкоў, абгарадзіў яе і ўмацаваў словам, і прадставіў яе Хрысту непарушнаю і непахіснаю. Малі Яго выбавіць ад тленнасьці ўсіх, што з вераю спраўляюць пачэсную памяць тваю.

Благаславёны і баганосны Кірыла, ты прасьвятліў свой розум зьзяньнем Духа, і сам быў быццам прамяністае сонца, што пасылае промні сваіх навучаньняў, прасьвятляе ўсіх верных, і адганяе цемру ерасяў сілаю Таго, хто зазьзяў ад Дзевы.

Дабрынёю словаў тваіх Царква ўся ўпрыгожваецца, добрапачэсна ўзбагачваецца цудоўнымі дабротамі, і шануе сьвятую памяць тваю, сьвяты Кірыла, прававерных пахвала, айцоў вяршыня, абаронца Усесьвятое Багародзіцы на Саборы.

Слава...

(*Тон 6*). Уславім Хрыстовага сьвятаначальніка Апанаса, які зьвёў у ніштo выдумкі Арыя, і ва ўсім сьвеце ясна прапаведаваў дзяржаву Сьвятое Тройцы, — адзінага і неразьдзельнага ў трох

асобах Бога. Ён моліць Яго за нас, якія з вераю спраўляем ягоную памяць.

Цяпер...:

*Багародзічны (тон 6).* Люты вораг, поўны зайздрасьці, усё змагаецца супраць статку Твайго, Усячыстая, каб прыдбаць сабе спажыву, але Ты, Багародзіца, выбаў нас ад такой бяды.

*Або Крыжабагародзічны (тон 6).* Калі Чыстая Дзева і Маці Твая, Збавіцелю, бачыла, як беззаконныя людзі прыбілі Цябе несправядліва да крыжа, душа Яе была параненая, як прадказаў некалі Сямён.

**Вершапесьні актойху**

Слава...

(*Тон 3*). Быццам залатацечны Ніл, аднайменьнік несьмяротнасьці Апанас навадняе ўсіх залатымі струменямі несьмяротнасьці і навучае пакланяцца адзінадзяржаўнай неразьдзельнай Тройцы. Ён крынічыць боскія навукі, поіць розумы верных, і моліцца за душы нашыя.

Цяпер...

*Багародзічны (тон 3).* Багародзіца Дзева Маці, сьвятая між жанчынаў, малі Уладара і Бога, якога Ты нарадзіла, каб Ён збавіў нас у чалавекалюбстве сваім.

*Або Крыжабагародзічны (тон 3).* Калі Ты ўбачыла на крыжы незаходнае Сонца, што зазьзяла з улоньня Твайго і зацьміла промні сонечныя, Ты, прыбітая бязьмерным болем, усклікнула: "Ты, што дабравольна зайшоў, зазьзяй зноў, каб прасьвятліць Мяне і ўвесь сьвет."

**Адпушчальны трапар**

(*Тон 3*). Вы зазьзялі ўчынкамі правай веры, усё благое навучаньне пагасілі, і явіліся пераможцамі, правай вераю ўзбагаціўшы ўсіх, Царкву цудоўна ўпрыгожыўшы, і дастойна дасягнулі Хрыста Бога, які дае ўсім веліч зьмілаваньня.

19 студзеня

## СЬВЯТОГА АЙЦА НАШАГА МАКАРА ЯГІПЕЦКАГА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..."**

(*Тон 6*). Калі ты, цудоўны Макар, зажадаў існага шчасьця, што пераўзыходзіць розум, устрыманасьць сталася для цябе страваю, беднасьць — багацьцем, нястача — дастаткам, і пакора — блаславенствам. Дзеля гэтага ты дасягнуў таго, чаго жадаў, і пасяліўся ў жытлах сьвятых.

Шлях устрыманасьці ты мужна прайшоў і веру захаваў. Дзеля гэтага ты атрымаў вянец справядлівасьці ад Хрыста, які ўзнагароджвае па заслугах, і раздае гонар і заплату за высілкі. Маліся, каб і нам атрымаць тое самае.

Цягу да асалодаў ты, багамудры, адагнаў, утаймаваўшы цела і прытупіўшы пачуцьці ўстрыманасьцю і строгім жыцьцём, пераносячы цярпліва ўсе напасьці і цяжкасьці. Дзеля гэтага ты атрымаў бясконцую асалоду, і непрамінальную невыказную радасьць.

Слава...

(*Тон 8*). Цешся, Ягіпет, што прарасьціў такога грамадзяніна, — Макара, благаслаўлёнага сярод блаславёных. Ён, упрыгожаны мудрасьцю Сьвятога Духа, даў усім прыклад устрыманасьці і дабрадзейнага жыцьця. Маючы яго сваім хадайнікам, просім яго маліць Хрыста, каб Ён збавіў душы нашыя.

Цяпер...:

*Багародзічны (тон 8).* Глянь на ўздыханьні скрушлівага сэрца майго, Боганявеста; прымі, Чыстая Дзева Марыя, рук маіх уздыманьне, і ў чалавекалюбстве Тваім не адкінь мяне, Беззаганная, каб мне славіць і ўзьвялічваць Цябе, якая ўзьвялічыла род наш.

*Або Крыжабагародзічны (тон 8).* Калі Чыстая Дзева ўбачыла, як вялі Цябе, быццам ягнё, на ахвяру, Яна пайшла за Табою, Слова, і са сьлязьмі клікала: "Куды сьпяшаешся, Сыне мой? Іду з Табою, Наймілейшы, бо не магу быць без Цябе, Ісусе мой міласэрны."

**Вершапесьні актойха**

Слава...

(*Тон 6*). Пачэсны ойча, па ўсёй зямлі разышлася вестка пра твае ўчынкі. Таму на небе ты атрымаў заплату за твае подзьвігі, зьнішчыў сілу дэманаў, і дасягнуў анёльскіх хораў, жыцьцё якіх ты пераймаў на зямлі. Маючы сьмеласьць у Хрыста Бога, прасі Яго даць супкой душам нашым.

Цяпер...

*Багародзічны (тон 6).* Ніхто, што прыходзіць да Цябе, не адыходзіць пасаромлены, Найчыстая Дзева, але просіць ласкі і атрымлівае дары згодна з просьбаю.

*Або Крыжабагародзічны (тон 6).* Калі беззаганная Багародзіца ўбачыла, як Жыцьцё наша вісіць на дрэве, Яна па-матчынаму заплакала і ўсклікнула: "Сыне і Божа мой, збаў тых, што з любоўю славяць Цябе."

**Адпушчальны трапар**

(*Тон 1*). Пустыні жыхарам, анёлам у целе і цудатворцам ты быў, ойча наш Макар; пастом, нядрэмнасьцю і малітваю нябесныя дараваньні прыняўшы, ацаляеш нядужых і душы тых, што з вераю прыходзяць да цябе. Слава Таму, хто даў табе сілу; Слава Таму, хто ўславіў цябе; слава Таму, хто праз цябе дае ўсім ацаленьні.

## 20 студзеня

# СЬВЯТОГА І БАГАНОСНАГА АЙЦА НАШАГА АЎХІМА ВЯЛІКАГА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..."**

(*Тон 1*). Ойча Аўхіме, анёл прадвясьціў тваё нараджэньне, як некалі Яна Прадвесьніка, які быў зачаты ва ўлоньні няплоднае. Ты быў ягоным пераймальнікам, норавам падобным да яго: бяздомны, ты не шукаў сабе дастаткаў, і, жывучы ў горах, зазьзяў шматлікімі цудамі.

Плод няплоднае, ты, ойча Аўхіме, стаўся шматдзетным: ад духоўнагя семя твайго непраходная пустыня напоўнілася манахамі. Маліся цяпер даць душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

Ойча Аўхіме, цудоўнае жыцьцё тваё і вера праўдзівая: ад дзеяньня ты, аселішча мудрасьці, узьнёсься да найвышэйшага сузіраньня, і ўславіў аднаго з Тройцы, адзінага ў дзьвюх прыродах Хрыста. Малі Яго за душы нашыя.

Ойча Аўхіме, ты быў саўдзельнікам пакутаў Таго, хто на Крыжы рукі распасьцёр; пастом і умярцьвленьнем ты даў нам вобраз Ягонага ўваскрасеньня і славы. Малі Яго цяпер дараваць душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

Слава...: (*Тон 3*). Імя тваё, ойча Аўхіме, азначае "Дабратлівы", і ты, быццам другі Самуіл, быў пасьвячаны Богу ад улоньня маці. Манахаў жазло і ўмацаваньне, чыстае жыльлё Сьвятога Духа, выпрасі нам, якія шануем цябе, веліч зьмілаваньня.

Цяпер...: Як нам не дзівіцца богачалавечаму мацярынству Твайму, Усячыстая? Ня ведаючы мужа, Ты, бязьвінная, нарадзіла ў целе без Айца Сына — народжанага спрадвеку без маці ад Айца, — які не пацярпеў ніякай зьмены ці разьдзяленьня, але поўнасьцю зьбярог прыкметы дзьвюх прыродаў. Дык малі Яго, Дзева Маці ўладарная, каб Ён збавіў душы тых, што верна вызнаюць Цябе Багародзіцай.

**Чытаньні:** *Гл. службу сьвятому Антону, с. 16*

**Вершапесьні**

(*Тон 5*). Радуйся, ойча сьвяты, удабрэньне Царквы; тваім нараджэньнем разьбіліся аб провід Божы намеры ворагаў праўдзівай веры. Таму ты сапраўды праўдзіва названы дабратлівым: нябесныя хоры ты напоўніў радасьцю і сьветласьцю жыцьця свайго. Цяпер, жывучы з імі, напоўнены сьвятлом і Боскім зьзяньнем, малі Хрыста даць душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Верш.* Дарагая перад Госпадам сьмерць сьвятых Яго.

Умацаваны дрэвам Крыжовым, ты высушыў струмені беззаконьня; напоены ручаём Боскай слодычы з райскай крыніцы, ты, блаславёны, паказаў у пустыні крыніцы збаўленьня. Асьвежаны струменямі Боскага Духа, ты, багамудры, узьняўся на вышыню нябесную і явіўся стаўпом вогненным, поўным сьветлага зьзяньня. Малі Хрыста даць душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Верш.* Шчасьлівы муж, які баіцца Госпада і суцяшэньне знаходзіць ў запаветах Яго.

Ты, ойча Аўхіме, з радаснаю і сьветлаю душою дайшоў да цудоўнае скініі, да дому Божага, дзе чутны сьвяточны шум і салодкія сьпевы, і невыказная асалода, і краса саўдзельніцтва ў Боскім жыцьці. Жадаючы толькі гэтага адзінага, ты ўмярцьвіў сваё цела і ўпрыгожыў яго Боскай красою. Малі Хрыста, даць нам веліч зьмілаваньня.

Слава...

Сьвяты ойча, ты ня даў заснуць вачом тваім, ані задрамаць павекам тваім, пакуль душу і цела не вызваліў ад страсьцяў і не прыгатаваў жыльля Духу. І вось Айцец з Сынам пасяліліся ў табе. Угоднік адзінасутнае Тройцы, вялікі прапаведнік, ойча Аўхіме, маліся за душы нашыя.

Цяпер...

Блаславёная Ты, Багародзіца Дзева, мы, верныя, славім Цябе належна, як горад непахісны, сьцяну непарушную, надзейную заступніцу і прыстанішча душаў нашых.

**Адпушчальныя трапары**

(*Тон 4*). Весяліся, пустыня няплодная, цешся, што ня ведала родавых боляў, бо вось муж жаданьняў духоўных размножыў у

табе дзетак, нарадзіўшы іх пабожнасьцю і ўзгадаваўшы ўстрыманасьцю ў дабрадзейнасьцях. Малітвамі яго, Хрысьце Божа, даруй нам спакойнае жыцьцё.

Слава... цяпер...

Тайна, спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая, праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і пацярпеўшы дзеля нас добраахвотна на крыжы, уваскрасіў ім першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

## 21 студзеня

## СЬВЯТОГА АЙЦА НАШАГА МАКСІМА ВЫЗНАЎЦЫ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 4).* Той, хто дзеля літасьці да нас дабравольна стаўся чалавекам, паказаў, што мае дзьве волі і два дзеяньні: так ты, Максіме, навучаў і зачыняў вусны бессаромнікаў. Ты ўвесь час прапаведаваў супраць тых, якія, спакушаныя д'яблам, сьцьвярджалі, што Хрыстос мае толькі адну волю і адно дзеяньне.

Бласлаўлёны Максіме, ты сілаю вучэньня твайго змусіў замоўкнуць ілжывага Піра; за гэта ты цярпеў перасьлед і выгнаньне, і адсячэньне языка і правае рукі, якую ты заўсёды ўзносіў у малітве да Бога і якою ты пісаў твае натхнёныя словы.

Быццам пяро, абмочанае Духам, быў твой, бласлаўлёны Максіме, язык, які ласкаю пісаў на табліцах сэрцаў нашых закон Боскіх дабрадзейнасьцяў і яснае вучэньне аб уцелаўленьні ў дзьвюх прыродах і адной асобе Хрыста.

Слава...

(*Тон 8*). Шануем цябе, ойча Максіме, як духоўнага праведніка, які паказаў нам, як ісьці па правым шляху. Бласлаўлёны ты, бо ты служыў верна Хрысту і асудзіў і выкрыў моцнага ворага. Цяпер ты прабываеш з анёламі і з усімі сьвятымі. Разам з імі маліся Госпаду даць зьмілаваньне душам нашым.

Цяпер...

*Багародзічны (тон 8).* Глянь на ўздыханьні скрушлівага сэрца майго, Боганявеста; прымі, Чыстая Дзева Марыя, рук маіх уздыманьне, і ў чалавекалюбстве Тваім не адкінь мяне, Беззаганная, каб мне славіць і ўзьвялічваць Цябе, якая ўзьвялічыла род наш.

*Або Крыжабагародзічны (тон 8).* Калі Чыстая Дзева ўбачыла, як вялі Цябе, быццам ягнё, на ахвяру, Яна пайшла за Табою, Слова, і са сьлязьмі клікала: "Куды сьпяшаешся, Сыне мой? Іду з Табою, Наймілейшы, бо не магу быць без Цябе, Ісусе мой міласэрны."

**Вершапесьні актойха**

Слава...

(*Тон 8*). Шануем цябе, ойча Максіме, як настаўніка мноства манахаў, бо мы ўсе навучыліся хадзіць тваёю праваю сьцежкаю. Шчаслівы ты, бо, паслужыўшы верна Хрысту, і разьбіўшы варожую сілу, ты стаўся суразмоўцам анёлаў і саўдзельнікам сьвятых праведнікаў. Разам з імі маліся Госпаду, каб Ён дараваў душам нашым веліч зьмілаваньня.

Цяпер...

*Багародзічны (тон 8).* Радуйся, Хорам адухоўлены, Галубка духоўная! Радуйся, Горад Творцы Твайго! Радуйся, Прытулак бясьпечны верных і Ахова; Заступніца тых, што любяць Цябе, Збаўленьне і Вызваленьне! Радуйся, Мост, што ўсіх праводзіць да неба; радуйся адухоўленая сьвятая Уладарка!

*Або Крыжабагародзічны (тон 8).* Калі сонца ўбачыла, як Ты, Сонца праведнасьці, Госпадзе, вісіш на крыжы, яно схавала промні свае, месяц сьвятло на цемру перамяніў, і боль працяў сэрца Маці Тваёй.

**Адпушчальны трапар**

(*Тон 8*). Правай веры настаўнік, набожнасьці прыклад і чысьціні, сьветач сусьветны, Богам натхнёная сьвятароў аздоба, Максіме мудры, навукаю тваёю ты ўсіх прасьвятліў, жалейка духоўная. Малі Хрыста Бога за збаўленьне душаў нашых.

## 22 студзеня

# СЬВЯТОГА АПОСТАЛА ЦІМАФЕЯ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 1*). Прасьветлены промнямі Духа, ты, сьвятаяўны Цімафей, сам быў ясным сьветачам, што ласкаю прасьвятліў усю зямлю, абышоўшы яе. Цяпер маліся, каб душам нашым атрымаць супакой і веліч зьмілаваньня.

Багамудры Цімафею, ты, напіўшыся са струменя слодычы, пераймаючы Хрыста, багамудра напаіў разуменьнем Бога тых, якія гэтага шчыра жадалі. Адышоўшы да Яго з радасьцю, цяпер ты сузіраеш у супакоі славу сьветлую Тройцы.

Багамудры Цімафею, умацаваны частымі недамаганьнямі слабасьцямі цялеснымі, усе хістаньні ты лёгка перамог, розум свой, блаславёны, сілаю Хрыстовую абгарадзіў і прапаведаваў нам голасна Боскае Евангельле супакою.

Слава...

(*Тон 8*). Богам прадвызначаны, і мудрага Паўла вучань, ты навучыўся Боскага, пажыў добра, веру да крыві захаваў, і быў верным сьвятаначальнікам, Цімафею апостале. Пабіты кіямі і камянямі, Ты выкрыў ідальскую ману і атрымаў вянец мучаніка. Цяпер, блаславёны, маліся за нас, якія з вераю спраўляем памяць тваю.

Цяпер...

*Багародзічны (тон 8).* Глянь на ўздыханьні скрушлівага сэрца майго, Боганявеста; прымі, Чыстая Дзева Марыя, рук маіх уздыманьне, і ў чалавекалюбстве Тваім не адкінь мяне, Беззаганная, каб мне славіць і ўзьвялічваць Цябе, якая ўзьвялічыла род наш.

*Або Крыжабагародзічны (тон 8).* Калі Чыстая Дзева ўбачыла, як вялі Цябе, быццам ягнё, на ахвяру, Яна пайшла за Табою, Слова, і са сьлязьмі клікала: "Куды сьпяшаешся, Сыне мой? Іду з Табою, Наймілейшы, бо не магу быць без Цябе, Ісусе мой міласэрны."

**Вершапесьні актойха**

Слава...

(*Тон 1*). Прыйдзіце, людзі, усхвалім Цімафея, сьветач верных, што зазьзяў у Евангельлі; ускліknем яму: "Радуйся, парастак веры, духоўны сын боскага Паўла; радуйся, пачэсны знаўца дабрадзейнасьцяў, мудрыя вусны Слова. Радуйся, жалейка веры, і ўмацаваньне Царквы."

Цяпер...

*Багародзічны (тон 1).* Майсей прароцкімі вачыма бачыў Цябе, Дзева ўсяхвальная, у вобразе незгаральнага куста, бо Боскі агонь не спаліў Твайго, Чыстая, улоньня. Дзеля гэтага просім Цябе, Маці Бога нашага, выпрасіць сьвету супакой і веліч зьмілаваньня.

*Або Крыжабагародзічны (тон 1).* Калі беззаганная Дзева ўбачыла Цябе, Збавіцелю, узьнесенага на крыжы, Яна з плачам ускліknула: "Гора мне, мілае Дзіця маё! Што здарылася і як гэта Ты, які трымаеш усё рукою Тваёю, быў прыбіты цялесна да дрэва?"

**Адпушчальны трапар**

*(тон 4).* Навучаны лагоднасьці, цьвярозы ва ўсім, апрануты ў правае сумленьне як належала сьвятару, ты, Цімафею апостале, піў невыказныя праўды з Выбранага Посуду, веру захаваў і годна прайшоў шлях жыцьця твайго. Малі Хрыста Бога за збаўленьне душаў нашых.

## 25 студзеня

## МІЖ СЬВЯТЫМІ АЙЦА НАШАГА РЫГОРА БАГАСЛОВА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 1*). Ойча Рыгор, нават магіла, месца забыцьця, не змагла зачыніць вуснаў тваіх; ты — багаслоўскі голас, што абвяшчае сьвету догмы пабожнасьці. Дык маліся, каб душам нашым атрымаць супакой і веліч зьмілаваньня.

Ойча мудры Рыгор, утаймаваўшы варожыя і шкодныя жаданьні цела, ты сеў на чатырохконную калясьніцу

дабрадзейнасьцяў, скіраваную да неба. Загледзеўшыся ў невыказную Дабрыню і напоўніўшыся ёю, цяпер даеш душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

Ойча Рыгор, ласкаю ты быў верным хадайнікам Бога і людзей; і цяпер, тваімі сьмелымі малітвамі даючы нам усеміласэрнага Хрыста, не пераставай маліць Госпада, сьвяты, даравацъ душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

(*Тон 2*). Прыйдзіце, сьвятымі песьнямі уславім багамоўнага Рыгора, вока ласкі, мудрыя вусны Духа Сьвятога, ясны сьветач сусьветны, вялікае царкоўнае прапаведаваньне, славу правай веры, цудоўны струмень багаслоўя, боскіх догмаў вечнацечную раку, крыніцу вечна жывую, поўную боскае вады нятленнасьці.

З любоўю ўсхвалім у песьнях сёньня сьвятаначальніка, роўнага норавам з апосталамі, змагара за пабожнасьць, поўню дабрамоўнасьці, салодкі струмень навучаньня, моц словаў высакамоўных; вусны, што гукалі быццам гром з неба; язык, што дыхаў агнём; мудрасьці скарбніцу, прапаведніка Слова, умацаваньне верных.

Песьнямі дастойнымі ўсхвалім багаслова, ахоўніка Хрыстовае паствы, лаўца ваўкоў і мудрага ачышчальніка ад пустазельля; цудоўнага сейбіта праўдзівых догмаў, ад ерасяў моцнага абаронцу, што, як належыцца, вырасьціў боскаю чуйнасьцю Хрыстовыя таленты, і прасьвятліў сьвет зьзяньнем боскіх вучэньняў.

Слава...

(*Тон 8*). Бадзёры язык твой, што адгукаецца ў сэрцах людзкіх, узьнімае душы лянівых. Багамоўнымі тваімі словамі будуецца лесьвіца, што вядзе ад зямлі да Бога. Дык, Рыгор багаслоў, не пераставай маліцца Хрысту, каб Ён выбавіў ад бедаў душы нашыя.

Цяпер...

Уладар нябесны дзеля любові да людзей на зямлі зьявіўся і з людзямі пажыў. Ён прыняў цела ад Чыстае Дзевы і, выйшаўшы з Ейнага ўлоньня, стаўся чалавекам. Ён Сын адзіны, двайны прыродаю, але не асобаю. Дзеля гэтага мы праўдзіва прапаведуем і вызнаем Хрыста Бога нашага як дасканалага Бога і дасканалага чалавека. Малі Яго, Дзева Маці, даць зьмілаваньне душам нашым.

Чытаньне кнігі Прыповесьцяў

Памяць праведнага поўная хвалы, і блаславеньне Гасподняе на галаве яго. Блаславёны той, хто набыў мудрасьць і знайшоў разуменьне. Лепш набываць мудрасьць чым золата і срэбра. Яна больш вартасная за каштоўныя камяні, усё, чаго б ты не жадаў, не зраўняецца з ёю. Даўгалецьце ў правай руцэ яе, а ў левай — багацьце і слава. З вуснаў яе цячэ справядлівасьць; закон і міласэрнасьць на языку ў яе.

Паслухайце мяне, дзеткі, бо важнае кажу, з вуснаў маіх выходзяць словы праўды. Шчасьлівы той, хто мяне слухае, штодня ля дзьвярэй маіх чакае, ля парогу варот маіх чувае. Бо хто мяне знайшоў, знайшоў жыцьцё і асягнуў ласку ў Госпада. Клічу вас, людзі; да сыноў людзкіх мой голас. Я — мудрасьць, разважлівасьць блізкая мне, маю глыбокую веду. У мяне рада і помач, мая разважнасьць і сіла. Я люблю тых, што мяне любяць; хто шукае мяне пільна, той знаходзіць. Прастадушныя, навучайцеся разважлівасьці і вы, неразумныя, набірайцеся розуму. Слухайце, бо я пра важныя рэчы гавару, шчырасьць адчыняе вусны мае. Вусны мае кажуць праўду, усё крывадушнае агіднае вуснам маім. Усе словы мае праўдзівыя, няма нічога няшчырага, крывадушнага ў іх. Усе яны ясныя для тых хто іх разумее, і праўдзівыя для тых, хто асягнуў мудрасьць. Вярніцеся на шлях мой. Вось я надзялю вас духам маім і навучу вас радам маім. Лагодны язык — дрэва жыцьця, а крывадушны губіць душу. *(10:7-8;3:13-16;8:6,34-35,4,12, 14, 17,5-9; 1:23; 15:4)*

Чытаньне кнігі Мудрасьці

Вусны праведнага крынічаць мудрасьць, вусны мужоў мудрых ведаюць ласку. Вусны мудрых навучаюць мудрасьці, іхняя праведнасьць выбаўляе іх ад сьмерці. Калі праведны муж памірае, назея ягоная не сканчаецца. Сын праведны родзіцца да жыцьця, і ў дабрыні сваёй зьбірае плады праведнасьці. Сьвятло для праведнага сьвеціць заўсёды, і ад Госпада атрымлівае ён ласку і славу. Язык мудрых добрае зьведае, у іхніх сэрцах спачыне мудрасьць. Любіць Госпад чыстых сэрцам, даспадобы Яму тыя, што ходзяць беззаганым шляхам. Мудрасьць Гасподняя прасьвятляе твар разумнага. Яна нават апярэджвае тых, што жадаюць пазнаць яе. Той, хто зранку шукае яе, не адчуе стомленасьці, і той, хто ня сьпіць дзеля яе, не зазнае суму. Яна сама абыходзіць і шукае годных яе, і ласкава зьяўляецца ім на шляху. Злосьць ніколі не пераможа мудрасьці. Дзеля гэтага я палюбіў і шукаў яе ад маладосьці маёй, і хацеў узяць яе сабе за нявесту. Уладар усіх палюбіў яе: яна — тайніца Божага розуму, і абранніца твораў Яго. Учынкі яе — дабрадзейнасьці: яна навучае чысьціні і розуму, справядлівасьці і мужнасьці, за якіх няма

нічога больш патэбнага ў жыцьці чалавека. Калі ж нехта хоча дасьведчыць большага, мудрасьць ведае мінулае і прадбачыць будучае; разумее тонкасьці словаў і дае развязкі загадкам; распазнае знакі і цуды, і наступствы часоў і гадоў. Яна — добры дарадчык для ўсіх, бо ў яе несьмяротнасьць, і асалода ў сяброўстве з ейнымі навучаньнямі. Дзеля гэтага я зьвярнуўся да Госпада, памаліўся Яму, і сказаў ад усяго сэрца майго: Божа айцоў і Госпадзе міласьці, Ты стварыў усё словам сваім, і мудрасьцю сваёю паставіў чалавека, каб ён панаваў над усімі істотамі, створанымі Табою, і кіраваў сьветам у сьвятасьці і справядлівасьці. Дай мне мудрасьць, што сядзіць побач з Табою на пасадзе Тваім, і не адлучы мяне ад дзяцей Тваіх, бо я слуга Твой, і сын слугі Тваёй. Пашлі мне яе (мудрасьць) з нябёсаў, ад сьвятога жыльля Твайго, ад пасаду славы Тваёй, каб яна была са мною і навучыла мяне ўсяго, што прыемна Табе. Хай яна кіруе маім розумам, і захоўвае мяне ў славе Тваёй. Бо намеры людзкія ўсе марныя, і думкі іхнія памылковыя. (Прып. 10; Мудр. 6,8,9)

Чытаньне кнігі Мудрасьці

Праведнік, хоць бы і памёр заўчасна, знойдзе супакой. Старасьць ягоная пачэсная не даўгалецьцем, яна ня мерыцца лікам гадоў; сівізна ягоная — мудрасьць, а мера старасьці — жыцьцё беззаганнае. Ён быў даспадобы Богу, знайшоў міласьць у Яго і, жывучы сярод грэшнікаў, быў забраны, каб злосьць не адмяніла думкі ягонай, і няшчырасьць не зьвяла душы ягонай. Бо прывабнасьць злога засланяе добрае, і бура пажадлівасьцяў зацямняе правы розум. Дасягнуўшы рана дасканаласьці, ён шмат пераджыў, бо душа яго была мілая Богу і таму Ён пасьпяшыў забраць яго з благога асяродзьдзя. А людзі бачылі гэта і не разумелі, і ня ўзялі сабе гэтага да сэрца, што міласэрнасьць і ласка Ягоная з выбранымі Ягонымі, і провід Ягоны са сьвятымі Яго. *(4:7-15)*

Вершапесьні

(*Тон 5*). Радуйся, крыніца багаслоўя, богасузіраньня высокага жытло: дасьледаваўшы пабожным розумам высокую глыбіню, ты, ойча, усім выясьніў злучэньне адзінага сьвятла ў трох сонцах, зьяднанага тоеснасьцю Боства, патройнага пачэснымі асобамі. Чысьцінёю жыцьця і сьветласьцю словаў тваіх ты, баганатхнёны, навучыў пакланяцца Тройцы ўсесьвятой. Малі Яе пасланць душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Верш.* Вусны мае кажуць словы мудрасьці, разважнасьць — роздум сэрца майго.

Зьзяньнем багаслоўя твайго ты разагнаў цемру ерасяў, імкнучыся намерана да Крыніцы сьвятла, каб далучыўся да сьветласьцяў, што адтуль плывуць. Прасьветлены твой розум ты, багаслове, зрабіў люстрам, у якое ты прыняў адзіны Прамень патройнага і неразьдзельнага сьвятла Боства. Малі Яго дараваць душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Верш.* Вусны праведнага абвяшчаюць мудрасьць, язык ягоны кажа праўду.

Радуйся, Божая рака, поўная заўсёды водаў ласкі, што цешыць горад Уладара Хрыста боскімі словамі і навучаньнямі; салодкі ручай, нязьведаная глыбіня, догмаў вядомы ахоўца законны; абаронца цёплы Сьвятой Тройцы, арган Духа Сьвятога, бадзёры розум, дабрамоўны язык, што выясьняе глыбіню пісаньняў. Малі цяпер Хрыста дараваць нам веліч зьмілаваньня.

Слава...

(*Тон 8*). Апрацоўваючы навучаньнямі тваімі сэрцы верных, быццам зямлю, ты, Рыгор, вырасьціў ў іх для Бога плады пабожнасьці, што заўсёды квітнеюць, высек у карані церні ерасяў і ўпрыгожыў пачуцьці чысьцінёю. Прымаючы нашыя пахвалы, Боская жалейка, бадзёрае вока, пастыраў пастыр, лавец ваўкоў, маліся няспынна, Багаслове, да Слова за душы нашыя.

Цяпер...

Чыстая Дзева, што Бога ў целе невыказна зачала, Маці Бога ўсявышняга, прымі маленьні слуг Тваіх, Усячыстая, дай ачышчэньне ад правінаў і, выслухаўшы малітвы слугаў Тваіх, маліся за збаўленьне душаў нашых.

**Адпушчальныя трапары**

**Трапар** *(тон 1).* Пастырская жалейка багаслоўскага вучэньня твайго трубы ілжывых настаўнікаў перамагла, бо табе, які спазнаў глыбіні Духа, быў дадзены красамоўства дар. Ойча сьвяты Рыгор, малі Хрыста Бога збавіць душы нашыя.

Слава.. цяпер...

Як толькі пачуўся голас Габрыеля, які казаў Табе, Дзева: "Радуйся!", Уладар усіх узяў цела ад Цябе, сьвятая Скарбніца, як прадказаў праведны Давід. Ты сталася больш прасторнай за неба, бо насіла ў сабе Творцу ўсяго. Слава Таму, хто пасяліўся ў Табе; слава Таму, хто выйшаў з Цябе; слава Таму, хто вызваліў нас нараджэньнем сваім.

**Трапар** *(тон 1).* Пастырская жалейка багаслоўскага вучэньня твайго трубы ілжывых настаўнікаў перамагла, бо табе, які спазнаў глыбіні Духа, быў дадзены красамоўства дар. Ойча сьвяты Рыгор, малі Хрыста Бога збавіць душы нашыя.

**Кандак** *(тон 3).* Багаслоўскім вучэньнем тваім, слаўны, ты доказы ілжывых настаўнікаў разьбіў, і аздобіў Царкву вопраткай праўдзівай веры, вытканай на вышыні; і вось Царква, апранутая ў яе, разам з дзецьмі тваімі духоўнымі кліча: "Радуйся, ойча Рыгор, вяршыня багаслоўскага розуму."

**Пракімен** *(Пс 48:4,2).* Вусны мае кажуць словы мудрасьці, разважнасьць — роздум сэрца майго.

*Верш.* Пачуйце гэта, усе людзі, слухайце уважліва, усе жыхары зямлі.

**Апостал.** 1 ~~Кар 12,7-1~~1 Гэб 7:26- 8:2

**Алілуя** *(Пс 77:1,2).* Слухай, народ мой, навукі маёй; прыхілі вуха тваё да слоў вуснаў маіх.

У прыповесьцях адчыню вусны мае, выяўлю тайны мінулых вякоў.

**Евангельле.** Ян 10:9-19

**Прычасьнік.** Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не збаіцца.

## 27 студзеня

## ПЕРАНЯСЕНЬНЕ МОШЧАЎ МІЖ СЬВЯТЫМІ АЙЦА НАШАГА ЯНА ЗАЛАТАВУСНАГА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 4).* Трубу з золата кавaную, боганатхнёны арган багаслоўя, мора невычэрпнае догмаў, умацаваньне царкоўнае, розум нябесны, глыбіню мудрасьці, залатую чашу, з якой мёдам цякуць салодкія рэкі вучэньня і пояць усё стварэньне, у звонкіх песьнях усхвалім. *(Двойчы)*

Зорку незаходную, якая сваімі промнямі прасьвятляе ўсё, што пад сонцам, прапаведніка пакаяньня, залатыя вусны, што асушаюць макрату роспачы і арашаюць сэрцы сатлелыя ад грахоў,— Яна, дастойна званага залатаслоўным, ушануем. *(Двойчы)*

Зямны анёл, нябесны чалавек, ластаўка дабраслоўная і шматгалосная, скарбніца дабрадзейнасьцяў, скала непарушная, прыклад верным, падобны да мучанікаў, спаўжыхар анёлаў сьвятых, роўны норавам з апосталамі, Ян Залатавусны хай будзе ўзьвялічаны ў песьнях. *(Двойчы)*

Слава ...

*(Тон 6).* Праведны і блаславёны ойча сьвяты, пастыру добры і вучню начальніка пастыраў Хрыста, што палажыў душу сваю за авечкі, прасі сёньня, усяхвальны Яне Залатавусны, Госпада даравць нам малітвамі тваімі веліч зьмілаваньня.

Цяпер...

*Дагматык (тон 6).* Хто Цябе не назаве шчасьліваю, Найсьвятая Дзева; хто ня будзе славіць, Чыстая, мацярынства Тваё? Адзінародны Сын, што спрадвеку зазьзяў ад Айца, ад Цябе, прыняўшы цела, у невыказны спосаб нарадзіўся. Будучы праўдзівым Богам, Ён стаўся праўдзівым чалавекам дзеля нас, непадзельны на дзьве асобы, але ў дзьвюх нязьлітных прыродах пазнавальны. Малі Яго, Чыстая і Блаславёная, даць зьмілаваньне душам нашым.

**Вершапесьні**

*(Тон 5).* Радуйся, залаты боганатхнёны арган Царквы, чалавекалюбны прапаведніку, які паказаў нам розныя прыклады пакаяньня; розум у золата апраўлены, ластаўка залатавусная; галубка, што зьзяе залатымі дабрадзейнасьцямі, струмень, з якога цякуць залатаносныя воды боскага вучэньня; вусны, якім даручана Боскае чалавекалюбства. Малі Хрыста дараваць душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Верш.* Вусны мае кажуць словы мудрасьці.

Радуйся, ойча сірот, пакрыўджаных хуткі памочнік, апякун бедных, карміцель галодных, настаўнік тых, што зграшылі, богапрыемны і пачэсны лекар душаў; пэўнае веданьне багаслоўя, выясьненьне пісаньняў духоўных, закону дзейны ахоўніча; правіла паступаньня вернае, мудрасьць высокая відзеньняў і дзеяньняў: Малі Хрыста дараваць душам нашым веліч зьмілаваньня.

*Верш.* Вусны праведніка абвяшчаюць мудрасьць.

Радуйся, Залатавусны — кліча Царква, — бо ты зазьзяў на ўвесь сьвет дабрадзейнасьцямі і пэрлавымі словамі ясьней за прамені сонечныя; больш мудры за мудрых, выдатны красамоўца, праўдзівых догмаў абаронца, ілжых выкрывальніча, настаўніча пакаяньня; радуйся, ціхае мора розуму, што, быццам другі Павал вялікі, вуснамі і розумам пацёк усьлед за Хрыстом. Малі Яго даць душам нашым веліч зьмілаваньня.

Слава ....

*(Тон 6).* Труба залатагалосная, залатаслоўны Залатавусны, азалаці сэрцы верных залатацечнымі вучэньнямі тваімі: голас настаўленьняў тваіх, ойча сьвяты, па-прароцку загучаў і прасьвятліў усе канцы зямлі.

Цяпер ....

*Багародзічны (Тон 6).* Творца і Збавіцель мой, Усячыстая, Госпад Ісус Хрыстос, выйшаўшы з улоньня Твайго, у мяне апрануўся і ад першага Адамавага праклёну вызваліў. Дзеля гэтага Табе, Бязьвінная, як Маці Божай і Дзеве, разам з анёлам нязмоўкна ўсклікаем "Радуйся!" Радуйся, Уладарка, заступніца, абарона і збаўленьне душ нашых!

**Адпушчальныя трапары.**

***Трапар сьвятога*** *(тон 8).* Ласка, што з вуснаў тваіх зазьзяла, быццам полымя, сусьвет асьвяціла, бескарысьлівасьці скарбы сьвету прыдбала, вышыню пакорлівасьці нам паказала. Ойча Яне Залатавусны, настаўніча наш, малі Слова Хрыста Бога збавіць душы нашы.

***Багародзічны*** *(тон 8).* Ты, што дзеля нас нарадзіўся ад Дзевы і на крыжы пацярпеў, сьмерцю зьнішчыўшы сьмерць і паказаўшыся Богам ва ўваскрасеньні, не пагардзі творамі рук Тваіх, пакажы чалавекалюбства Тваё, Міласэрны, прымі малітвы за нас Багародзіцы, якая радзіла Цябе, і збаў, Збавіцелю добры наш, людзей бездапаможных.

## ЛІТУРГІЯ

**Трапар** *(тон 8).* Ласка, што з вуснаў тваіх ... *(Гл. вышэй)*

**Кандак** *(тон 6).* Сьвяты і блаславёны Яне Залатавусны, ты прыняў з неба Божую ласку навучаць усіх пакланяцца ў Тройцы адзінаму

Богу. Дастойна хвалім цябе, бо ты наш настаўнік і Боскіх праўдаў вяшчальнік.

**Пракімен** *(Пс 48:4,2).* Вусны мае кажуць словы мудрасьці, разважнасьць — роздум сэрца майго.

*Верш.* Пачуйце гэта ўсе людзі, слухайце ўважліва ўсе жыхары зямлі.

**Апостал:** Гэб 7:26-8:2

**Алілуя** *(Пс 36:30,31).* Вусны праведніка абвяшчаюць мудрасьць, язык яго кажа праўду.

*Верш.* Закон Бога Яго ў сэрцы ягоным, ногі яго не спатыкнуцца.

**Евангельле:** Ян 10:9-16

**Прычасьнік** *(Пс 111:6-7).* Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не збаіцца. Алілуя, алілуя, алілуя.

## 28 студзеня

## СЬВЯТОГА АЙЦА НАШАГА АХРЭМА СЫРЫНА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 1*). Углядючыся ў райскія даброты і насалодзіўшыся з пладоў нятленнага саду, ты, блаславёны, узрасьціў сьвету Боскае пазнаньне, прымаючы якое з любоўю, мы ўзрастаем духоўна.

Ты напісаў пра прыйсьце Судзьдзі, струменямі сьлёзаў навучаючы запаліць свечы душаў, клічучы голасна пра прыйсьце Жаніха, каб апрануцца ў сьветлую вопратку, сустрэць нам Жаніха Хрыста.

Ты абгарадзіў цела ўстрыманасьцю, рухі страсьцяў умярцьвіў, ойча, малітвамі і начнымі стаяньнямі. Таму сіла Духа пасялілася ў табе, і паказала цябе як сусьветны духоўны сьветач.

Слава...

(*Тон 6*). Ты, Ахрэм вечнапамятны, ухіліўся разумна ад жыцьцёвых клопатаў, дзеля любові да супакою аддаліўся ў пустыню, і там дзейсна стараўся ўзьняцца да Бога. Зазьзяўшы

сьветачам на ўвесь сьвет, ты крынічыў людзям словы жыцьця. Не пераставай малітвамі тваімі, ойча сьвяты, умацоўваць нас і ахоўваць ад ворагаў душы нашыя .

Цяпер...

*Багародзічны (тон 6).* Люты вораг, поўны зайздрасьці, усё змагаецца супраць статку Твайго, Усячыстая, каб прыдбаць сабе спажыву, але Ты, Багародзіца, выбаў нас ад такой бяды.

*Або Крыжабагародзічны (тон 6).* Калі Чыстая Дзева і Маці Твая, Збавіцелю, бачыла, як беззаконныя людзі прыбілі Цябе да крыжа, душа Яе была параненая, як прадказаў некалі Сямён.

**Вершапесьні актойха**

Слава...

(*Тон 4*). Па-прароцку абмываючы сьлязьмі ложак свой, і спосабам жыцьця творачы пакаяньне, ты паказаў нам страх суду справамі і на словах. Дзеля гэтага мы ўсе, сабраўшыся, шануем памяць тваю, цудадзейны Ахрэм вечнапамятны, і просім цябе: маліся Хрысту Богу за душы нашыя.

Цяпер...

*Багародзічны (тон 4).* Выбаў нас ад бедаў нашых, Маці Хрыста Бога, што нарадзіла Творцу ўсіх, каб нам клікаць: "Радуйся, адзіная заступніца душаў нашых!"

*Або Крыжабагародзічны (тон 4).* Меч, як сказаў некалі Сямён, параніў сэ рца Тваё, усесьвятая Уладарка, калі Ты ўбачыла як Той, хто невыказна нарадзіўся ад Цябе, быў асуджаны беззаконнымі людзьмі, узьнесены на крыж і прыбіты да яго, пакаштаваў воцату і жоўці і быў прабіты кап'ём у бок. Заплакаўшы па-матчынаму, Ты ўсклікнула: "Што гэта за новая тайніца, Дзіця любае маё?"

**Адпушчальны трапар**

(*Тон 8*). Струменямі сьлёз тваіх пустыню бясплодную ты ўрадліваю зрабіў і стогнамі душы плады высілкаў у сто разоў памножыў, і быў для ўсіх сьветачам, зьзяючы цудамі, Ахрэме, ойча наш. Малі Хрыста Бога збавіць душы нашыя.

## ТРОХ СЬВЯТАНАЧАЛЬНІКАЎ: БАЗЫЛЯ ВЯЛІКАГА, РЫГОРА БАГАСЛОВА І ЯНА ЗАЛАТАВУСНАГА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*). Арганы ласкі, гусьлі Духа, славутыя трубы прапаведаваньня, страшныя і звонкія громы з вышыні, што абвяшчаюць славу Божую на ўвесь сьвет, трох прапаведнікаў Сьвятое Тройцы, Яна і Базыля разам з Рыгорам дастойна ўславім.

Тройцы змагары, дабрадзейнасьці шчыты, пасьля дванаццаці тры апосталы, рэкі жывой вады, што цякуць з раю і пояць боскімі струменямі твар зямлі, пачаткі багаслоўя, хай будуць ушанаваныя.

Няма такога, як сказана, хто б не чуў іхніх слоў і навучаньняў, бо па ўсёй зямлі разышлося прапаведаваньне боскіх і мудрых сусьветных настаўнікаў. Вучэньнем іх усе канцы зямлі злучаныя ў адно ў праўдзівай веры.

Арганы Духа Сьвятога, трубы праўды, прапаведнікаў красамоўных Слова ўславім у песьнях, ідучы ўсьлед за іх вучэньнямі. Паколькі яны маюць вялікую ласку ў Госпада, будзем маліцца да іх за супакой на ўсім сьвеце і адпушчэньне нашых грахоў.

(*Тон 2*). Якімі пахвальнымі вянкамі ўпрыгожым трох настаўнікаў, разьдзеленых целам, але зьяднаных духам, баганосных абаронцаў і слугаў Найсьвятое Тройцы, ясныя сусьветныя сьветачы, стаўпы царкоўныя? Іх, як пераможцаў, вянцом славы вянчае Хрыстос Бог наш у вялікай міласэрнасьці сваёй.

Якімі радаснымі песьнямі ўсхвалім баганосных сузіральнікаў і прапаведнікаў, праўдзівай веры выдатных багасловаў: сьвятога Базыля Вялікага, боскага Рыгора Багаслова, і Яна Залатавуснага, якіх дастойна праславіла Тройца, Госпад Бог у вялікай міласэрнасьці сваёй.

Якімі пахвальнымі словамі ўславім сьвятаначальнікаў, ласкаю і дараваньнямі роўных апосталам, зьнішчальнікаў нязбожнасьці? Яны — сусьветныя настаўнікі, якія навучаюць усіх словам і прыкладам, пастыры Хрыстападобныя, зямныя анёлы, нябесныя

людзі, якіх ушанаваў Хрыстос Госпад славы ў вялікай міласэрнасьці сваёй.

Якімі пахвальнымі вянцамі ўпрыгожым Залатаслова, і разам з ім Базыля і Рыгора, пачэсныя аселішчы Духа, цьвёрдых абаронцаў веры, стаўпы царкоўныя, верных умацаваньне, пацяшэньне ўсіх, што зграшылі, крыніцы жывое вады, чэрпаючы якую задавальняем душы нашы, просячы адпушчэньня грахоў і велічы зьмілаваньня.

Слава ...

(*Тон 6*). Уславім сёньня баганосных айцоў, тайныя трубы Духа, што пасярод царквы засьпявалі стройную песьню багаслоўя пра адзіную і неразьдзельную прыродай і боствам Тройцу; будучы пераможцамі Арыя і абаронцамі верных, яны моляцца безустанку Госпаду за збаўленьне душаў нашых.

Цяпер...

*Дагматык (тон 6).* Хто Цябе не назаве шчасьліваю, Найсьвятая Дзева; хто ня будзе славіць, Чыстая, мацярынства Тваё? Адзінародны Сын, што спрадвеку зазьзяў ад Айца, ад Цябе, прыняўшы цела, у невыказны спосаб нарадзіўся. Будучы праўдзівым Богам, Ён стаўся праўдзівым чалавекам дзеля нас, непадзельны на дзьве асобы, але ў дзьвюх нязьлітных прыродах пазнавальны. Малі Яго, Чыстая і Блаславёная, даць зьмілаваньне душам нашым

**Чытаньне кнігі Другога Закону**

У той час сказаў Майсей сыном Ізраілевым: "Вось даю вам зямлю — ідзеце, вазьмеце яе сабе ў спадчыну, якую Госпад кляўся даць айцом вашым Абрагаму, Ізааку і Якубу, і нашчадкам іх. У той час я сказаў вам: я не змагу адзін узяць на сябе вашыя цяжкасьці. Госпад Бог ваш размножыў вас — сёньня вас, як зорак у небе. І няхай Госпад, Бог айцоў вашых, размножыць вас яшчэ ў тысячу разоў і блаславіць вас, як абяцаў. Але як жа мне аднаму насіць вашыя цяжкасьці, вашыя клопаты і непаладкі? Дык абярыце сабе спаміж каленаў вашых мужоў разумных, паважных і дасьведчаных, і я пастаўлю іх вам начальнікамі. І вы мне адказалі: добрую рэч хочаш зрабіць. Дык вось я ўзяў старшыняў з каленаў вашых, мужоў мудрых, паважных і дасьведчаных, і паставіў іх тысячаначальнікамі, сотнікамі, пяцідзесятнікамі і дзесятнікамі, каб былі кіраўнікамі ў каленах вашых. У той самы час я даў такі наказ судзьдзям вашым: Выслухоўвайце братоў вашых, судзеце справядліва справу кожнага, з братам яго ці з чужынцам. Калі

судзіце, не глядзеце на аблічча, выслухоўвайце аднолькава малога і вялікага, ня бойцеся нікога, бо суд Божы ёсьць." (*1:8-17*)

**Чытаньне кнігі Другога Закону**

У той час сказаў Майсей сыном Ізраілевым: "Неба і нябёсы нябёсаў, зямля і ўсё, што напаўняе яе, належаць Госпаду Богу твайму. Толькі да айцоў вашых прыхінуўся Госпад і палюбіў іх, і выбраў іх і іхняе патомства сярод іншых народаў — аж па сёньняшні дзень. Дык абрэжце сэрцы вашыя, і няхай шыі вашыя ня будуць цьвёрдымі. Бо Госпад Бог ваш — Бог над багамі і Уладар над уладарамі, Бог вялікі, магутны і страшны, які не зважае на асобу і не прымае падарункаў; Ён чыніць справядлівасьць сіраце і ўдаве, мілуе чужынца, даючы яму хлеб і вопратку. Вы таксама любеце чужынцаў, бо самі былі чужынцамі ў зямлі Ягіпскай. Госпада Бога твайго бойся, Яго трымайся, Яму служы і імем Ягоным кляніся. Ён — твая слава, Ён Бог твой, што ўчыніў для цябе вялікія і страшныя рэчы, якія ты бачыў на ўласныя вочы." (*10:14-21*)

**Чытаньне кнігі Мудрасьці**

Душы праведных у руцэ Бога, і мука не кране іх. Вачам неразумных здавалася, што яны памерлі, іхняе перастаўленьне ўважалася за няшчасьце, і адыход іх ад нас — за згубу; але яны прабываюць у супакоі. Бо, хоць паводле людзкога разуменьня іх сустрэла кара, надзея іх поўная несьмяротнасьці. Пацярпеўшы крыху, яны зазнаюць вялікіх дабрадзействаў. Бог іх дасьведчыў і знайшоў дастойнымі сябе. Ён іх выпрабаваў, як золата ў горне і прыняў іх як цэлапальную ахвяру. У дзень іхняга наведаньня яны зазьзяюць і рассыплюцца, быццам іскры па іржышчы. Будуць судзіць плямёны і панаваць над народамі, і Госпад будзе ўладаром іхнім давеку. Тыя, што спадзяваліся на Яго, зразумеюць праўду, верныя ў любові будуць з Ім прабываць. Бо ласка і міласэрнасьць Ягоная для сьвятых Яго, і Ён наведае выбраных сваіх. (*3:1-10*)

**Вершапесьні**

(*Тон 1*). Дастойна ўславім сёньня духоўных тайнасузіральнікаў, Божыя трубы і сьветачы, Базыля вялікага, боганатхнёнага Рыгора і слаўнага настаўніка Яна, сапраўды залатавуснага, які вылівае нам струмені Боскай навукі.

*Верш.* Хай праведныя сьвяткуюць ў славе і радуюцца на ложах сваіх.

Дастойнымі песьнямі ўзьвялічым асновы веры, Богам насаджаныя розумы, рэкі, што цякуць золатам, сьветлыя і пачэсныя сьветачы, змагароў Тройцы, поўных дараў Сьвятога Духа, непахісныя стаўпы, умацаваньне Царквы.

*Верш.* Сьвятары Твае, Госпадзе, апрануцца ў справядлівасьць і сьвятыя Твае ў радасьці жыць будуць.

Арганы Духа, трубы Боскага грому, маланкі прапаведаваньня, залатыя сьветачы Госпада, блаславёны Базыль, Рыгор мудры, залаты і ўсепачэсны Ян, маліце Хрыста збавіць тых, што шануюць вас.

Слава...

(*Тон 2*). Душы верных сёньня ўзносяцца ад зямлі да неба дзеля памяці сьвятых, бо нябесныя вароты адчыняюцца, і мы чуем іхняе прапаведаваньне: словамі сваімі яны прапаведуюць Слова, і языкамі сваімі ўсхваляюць цуды Яго. Дык усклікнем Збавіцелю: "Слава Табе, Хрысьце Божа, які праз іх даеш верным супакой."

Цяпер...

(*Тон 2*). Сёньня Хрыстос прыносіцца як дзіцятка ў сьвятыню, сёньня стае пад законам Той, хто Майсею даў закон; анельскія хоры дзівяцца, убачыўшы на руках старэчых Таго, хто трымае ўвесь сусьвет. Сямён, поўны пашаны, радасна кліча: "Адпусьці мяне цяпер, Збавіцелю, ад дачаснага жыцьця да вечнага супакою, бо я ўбачыў Цябе і ўзрадаваўся."

**Адпушчальныя трапары**

***Трапар сьвятых*** (*тон 4*). Роўныя апосталам і сусьветныя настаўнікі, Уладара ўсіх маліце, каб Ён дараваў супакой усяму сьвету і душам нашым багацьце свайго зьмілаваньня.

***Багародзічны.*** Тайна спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і, пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, уваскрасіў ім першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

## ЮТРАНЬ

**Пасьля "Госпад — Бог...":** *трапары як у канцы вячэрні*

**Сядальная песьня 1:** (*Тон 5*). Усхвалім Базыля, царскае ўпрыгожаньне Царквы, багатую скарбніцу навукі, што навучае

нас шанаваць Тройцу сьвятую, зьяднаную прыродаю, разьдзельную асобамі.

Слава...: (*Тон 4*). Сьветачы ясныя Царквы Хрыстовае, вы прасьвятлілі сьвет навукамі вашымі, багамудрыя айцы, высушылі ерасі ўсіх дрэннай славы, і пагасілі полымя блюзьнерчых закалотаў. Цяпер, як сьвятаначальнікі Хрыстовыя, вы моліцеся за нашае збаўленьне.

Цяпер...: Дзева ўсяхвальная, Маці Хрыста, Марыя Баганявеста, што мужа ня знала, верных Заступніца, збаў ад бяды і патрэбы, Уладарка Багародзіца, тых, што з вераю і любоўю прыбягаюць пад Тваё покрыва.

**Сядальная песьня 2.** *(Тон 3).* Ты быў стаўпом Царквы, скарбніцаю пабожнасьці, Рыгору багаслове, утаймаваў свае пажаданьні і зазьзяў. Ты выясьніў вучэньне пра Тройцу, сьвяты ойча. Малі Хрыста Бога за збаўленьне душаў нашых.

Слава...: (*Тон 4*). У садзе Сьвятых пісаньняў вы працавалі як мудрыя пчолы, зьбіраючы мёд з усіх кветак, каб ахвяраваць яго верным. Дзеля гэтага ўсе з радасьцю клічуць вам: "Пасьля сьмерці вы, блаславёныя застаецеся сярод тых, што спраўляюць вашую памяць."

Цяпер...: Грэшныя пажаданьні апанавалі мяне, Усячыстая, і я клічу: Не пагардзі мною, няшчасным, і ня дай мне згінуць, Ты, што нарадзіла Бездань міласэрнасьці. Апроч Цябе іншай надзеі ня маю, дык ня дай, каб мая надзея была на радасьць і сьмех ворагам маім. Ты можаш усё, як Маці Бога ўсіх.

**Узьвялічваньне пасьля паліелею.** Узьвялічваем вас, сьвятаначальнікі Хрыстовыя, і шануем памяць вашую, бо вы моліце за нас Хрыста Бога Нашага.

*Верш 1.* Шчасьлівыя беззаганныя, што ходзяць у законе Гасподнім.

*Верш 2.* Добры для мяне закон вуснаў Тваіх, лепшы за золата і срэбра.

*Верш 3.* Рукі Твае стварылі і ўпрыгожылі мяне: дай мне розум, каб мне навучыцца прыказаньням Тваім.

*Верш 4.* Глянь на мяне і зьмілуйся нада мною, як звычайна робіш з тымі, што любяць імя Тваё.

Слава... цяпер...

Алілуя, алілуя, алілуя. Слава Табе, Божа!

**Сядальныя песьні** . *(Тон 4).* Мудрыя сусьветныя настаўнікі, што праславілі на зямлі Бога словамі і ўчынкамі, хай сёньня узьвялічацца, бо яны — хадайнікі нашага збаўленьня.

Слава...: Царква сьвяткуе сёньня памяць трох настаўнікаў, якія ўмацавалі яе сваімі Боскімі навучаньнямі.

Цяпер...: Апякунка непераможная пакрыўджаных і Заступніца тых, што спадзяюцца на Цябе, вызвалі мяне ад бедаў, бо ты ўсіх Памочніца.

**Узыходныя песьні**: *першы антыфан 4 тону.*

**Пракімен.** Сьвятары Твае апрануцца ў справядлівасьць, і сьвятыя Твае ў радасьці жыць будуць.

Верш. Вусны мае кажуць праўду, разважнасьць — роздум сэрца майго.

**Евангельле**: Ян 10:9-16

Пасьля Пс 50:

Слава...: Малітвамі сьвятых айцоў...

Цяпер...: Малітвамі Багародзіцы...

Зьмілуйся нада мною...: Ласка пацякла з вуснаў вашых, сьвятыя айцы: вы былі пастырамі Царквы Хрыстовае, навучаючы духоўных авечак верыць у Тройцу адзінасутную ў адзіным Боствe.

**Канон**
(Тон 1)

**Песьня 1.** *Ірмас.* Прыйдзіце людзі, уславім у песьнях Хрыста Бога, які разьдзяліў мора, і кіраваў людзьмі, якіх вывеў з няволі Ягіпскай, бо Ён праславіўся.

*Катавасія.* Сонечныя промні калісьці асьвятлілі зямлю, што была ў глыбіні марской: бо вада па двух бакох сталася быццам сьцяна, а людзі перайшлі мора пехатою, сьпяваючы Богапрыемную песьню: "Пяём Госпаду, бо Ён уславіўся!"

**Песьня 3.** *Ірмас.* На камені веры умацаваўшы, ты адчыніў вусны мае супраць ворагаў маіх, і мой дух узрадаваўся, каб пяяць: Ніхто не сьвяты, апроч Бога нашага, і ніхто не праведны, апроч Цябе, Госпадзе.

*Катавасія.* Ты, Госпадзе, — умацаваньне тых, што спадзяюцца на Цябе. Умацуй Царкву Тваю, якую Ты набыў крывёю сваёю.

*Сядальныя пасьля трэцяй песьні:*

(*Тон 8*). Вялікія ясныя сьветачы, Царквы стаўпы непахісныя, усхвалім аднадушна, насалоджваючыся словамі іхнімі і ласкаю — мудрага Залатавуснага, і вялікага Базыля з Рыгорам, сьвятым багасловам. Дык усклікнем ім з глыбіні сэрца: "Тры вялікія сьвятыя айцы , маліцеся Хрысту Богу даць адпушчэньне правінаў тым, што з любоўю спраўляюць вашую памяць."

Слава...: Атрымаўшы мудрасьць ад Бога, быццам тры новыя апосталы Хрыстовыя, вы разумна выясьнялі догмы, якія раней рыбакі сілаю Духа аб'явілі простымі словамі. Бо трэба было, каб нашая простая вера атрымала глыбейшае зразуменьне. Дык усклікнем з глыбіні сэрца: "Сьвятыя тры і вялікія айцы, маліцеся Хрысту Богу, даць адпушчэньне правінаў тым, хто з любоўю спраўляе вашую памяць."

Цяпер...: Душу маю, Дзева, пакорную, якую кідаюць і топяць бурныя хвалі жыцьцёвых спакусаў, абцяжараную бярэмям правінаў і небясьпекаю апынуцца на дне, умацуй, Багародзіца, міласьцю малітваў Тваіх, і дай ёй цішыню, выбавіўшы ад бедаў. Прыстанішча спакойнае, маліся Сыну Твайму і Богу даць адпушчэньне правінаў мне, бо Ты адзіная надзея нягоднага слугі Твайго.

**Песьня 4.** *Ірмас.* Ты прыйшоў ад Дзевы, не хадайнік і не анёл, але сам, Госпадзе, што уцелавіўся і збавіў мяне, усяго чалавека. Таму клічу: "Слава сіле Тваёй, Госпадзе."

*Катавасія.* Ласка Твая, Хрысьце, пакрыла нябёсы. Выйшаўшы з каўчэга сьвятасьці — Тваe ўсячыстае Маці, — Ты явіўся як Дзіця на руках у сьвятыні славы Тваёй, і ўвесь сьвет напоўніўся хвалы Тваёй.

**Песьня 5.** *Ірмас.* Прасьвятленьне тых, што ў цемры, Збаўленьне зьняверaных, Хрысьце Збавіцелю мой, Цябе слаўлю зранку: Уладару сьвету, прасьвятлі мяне зьзяньнем Тваім, бо апроч Цябе іншага Бога ня знаю.

*Катавасія.* Ісая ўбачыў вобразна на пасадзе Бога, якога ўзносілі ў славе хэрувімы, і ўсклікнў: "Гора мне, бо я бачыў заўчасна Бога, які мае прыйсьці ў целе, Госпада незаходнага Сьвятла і Ўладара сьвету!"

**Песьня 6.** *Ірмас.* Бездань грахоў акружае мяне, і таму, як прарок, клічу: ад тленнасьці вызваль мяне, Госпадзе.

*Катавасія.* Стары Сямён убачыў на ўласныя вочы Збаўленьне, што прыходзіць ад Бога да людзей, і ўсклікнуў: "Ты, Хрысьце, — Бог мой!"

*Пасьля шостай песьні:*

**Кандак** *(тон 2).* Сьвятых і Богам натхнёных прапаведнікаў, вяршыні настаўнікаў, Ты, Госпадзе, узяў да сябе, даючы ім ў асалоду даброты Твае і супакой; высілкі і сьмерць іх Ты прыняў лепш за ўсе цэлапаленьні, Адзіны, які праслаўляеш сьвятых Тваіх.

*Ікас.* Хто зможа адчыніць вусны свае, каб уславіць тых, чые вусны дыхалі агонь сілаю Слова і Духа? Тым ня менш асьмельваюся, бо гэтыя тры сьвятыя айцы веліччу і колькасьцю дараваньняў пераўзышлі ўсіх, хто дасканаліўся у дзеяньнях і сузіраньні. Гэта Ты ўдастоіў слугаў сваіх шматлікіх дараваньняў, — Адзіны, які праслаўляеш сьвятых Тваіх.

**Песьня 7.** *Ірмас.* Богапраціўны загад беззаконнага мучыцеля ўзьняў высока полымя. Духоўную расу пабожным юнаком паслаў Хрыстос , блаславёны і ўсяслаўны.

*Катавасія.* Цябе, які паслаў расу юнаком, што ў печы блаславілі Цябе, і пасяліўся ў дзявочым улоньні, Бога-Слова славім і набожна пяём: "Блаславёны Бог айцоў нашых!"

**Песьня 8.** *Ірмас.* Бога, які зышоў у вогненную печ да габрэйскіх юнакоў, і пераменіў агонь на расу, слаўце, усе стварэньні як Госпада, і ўзьвялічвайце праз усе вякі.

*Катавасія* Багабойныя юнакі стаялі непашкоджаныя сярод нясьцерпнага агню і пялі Боскую песьню: "Благаславіце Госпада, усе творы Гасподнія, і ўзьвялічвайце Яго праз усе вякі!"

*Замест "Больш годную пашаны..." сьпяваем прыпевы:*

*Прыпеў:* Узьвялічвай душа мая , больш пачэсную за нябесныя хоры Чыстую Дзеву Багародзіцу.

**Песьня 9.** *Ірмас.* Беспачатнага Айца Сын, Бог і Госпад, узяўшы цела ад Дзевы, явіўся нам, прасьвятліў тых, што ў цемры, і сабраў расьцярушаных. Дзеля гэтага ўсяслаўную Багародзіцу ўзьвялічваем.

*Прыпеў.* Узьвялічвай, душа мая, тры вялікія сьветачы сярод сьвятаначальнікаў.

Вось ваш сад і вашая паства, для якой вы шмат працавалі. Усе зышліся, каб сёньня трох услравіць у вашай цудоўнай еднасьці.

*Прыпеў.* Узьвялічвай, душа мая, тры сьветлыя зоркі Хрыстовае Царквы.

Не двусечны, але трохсечны меч выстаўляе ласка на супраціўнікаў — меч, у небе каваны і загартаваны трымя сіламі, што змагаюцца за патройнае зьзяньне Боства.

*Прыпеў.* Узьвялічвай, душа мая, вялікіх настаўнікаў Царквы Хрыстовае.

Вашае жыльлё на небе, сьвятыя слаўныя, хоць вы насілі цела ў чысьціні давеку. Цяпер вы жывеце ў небе поўнасьцю, маліце , каб нам, што жывем на зямлі, накіроўваць думкі і дзеяньні да вышыні.

*Прыпеў.* Узьвялічвай, душа мая, больш пачэсную за нябесныя хоры Чыстую Дзеву Багародзіцу.

Безьліч цудаў Тваіх, Уладарка, прыцясьняе мяне і не дае мне сказаць слова, іх багацьце чыніць мяне бясьсільным належна ўславіць Тваю дабрыню. Тым ня менш слаўлю Таго, хто ўзьвялічыў Цябе.

*Катавасія.* Пад покрывам Закону і Пісаньняў вобраз нам, верным, дадзены: кожны сын першародны Богу пасьвячаецца. Дзеля гэтага мы ўзьвялічваем Першароднае Слова спрадвечнага Бога, Сына першароднага Дзевы Маці.

**Экзапастыляр** (сьвяцільнік). Усхвалім трох баганосных айцоў, тры ясныя сьветачы, ясьнейшыя за сонца, асьветленыя зьзяньнем Трохсонечнай еднасьці Трох Асобаў у адной прыродзе.

Слава...: Усхвалім сёньня носьбітаў сьвятла, сьветлыя маланкі: Базыля Вялікага, Рыгора Багаслова і Залатавуснага Яна.

Цяпер...: Адзінае Боства,— Ойча, Сыне і Духу,— малітвамі Базыля , Рыгора, Яна і ўсячыстае Багародзіцы, дай, каб мне ня быць пазбаўленым Тваёй славы.

**Пахвальныя псалмы**

(*Тон 5*). Радуйся, тройца сьвятых айцоў, вялікія абаронцы Царквы, стаўпы пабожнасьці, умацаваньне верных, ерасяў згуба.

Вы Хрыстовы народ пасьвілі навукамі і кармілі дабрадзейнасьцямі. Сьветлыя прапаведнікі ласкі, што настаўлялі на выкананьне запаветаў Хрыстовых, праваднікі да неба і ўзыходы да раю! Маліце Хрыста, каб даў душам нашым веліч зьмілаваньня. (*Двойчы*)

Радуйся, сьвятарская тройца, зямныя анёлы, што ўзышлі на неба! Вы — збаўленьне сьвету, радасьць для людзей і сусьветныя настаўнікі, абаронцы Слова, мудрыя лекары душэўных і цялесных немачаў, заўсёдыцечныя рэкі духоўныя, што навукамі пояць твар зямлі, асновы багаслоўя, боскія залатавусныя! Маліце Хрыста, каб даў душам нашым веліч зьмілаваньня

Радуйся, тройца сьвятаначальнікаў, сонцы зямнога скляпеньня, промні і сьветачы Трохсонечнага зьзяньня, прасьвятленьне тых, што ў цемры, духмяныя кветкі райскія! Рыгор багаслоў, мудры Базыль і Залатавусны, боганатхнёныя табліцы Духа, што точыце малако збаўленьня, упрыгожаньне мудрасьці, Маліце Хрыста, каб даў душам нашым веліч зьмілаваньня.

Слава...

(*Тон 5*). Заграем у трубы, і будзем радасна спраўляць радасна сьвята нашых настаўнікаў. Уладары і князі хай зыдуцца, і сьвятары хай пляскаюць у далоні і пяюць. Усхвалім тры вялікія паўнаводныя рэкі навучаньняў духоўных, што вядуць да вечнага жыцьця; пастыраў і настаўнікаў, усесьвятое Тройцы трох сьвятых тайнікаў. Філёзафы, хваліце мудрых; сьвятары — пастыраў; грэшнікі — заступнікаў; бедныя — памочнікаў; сумныя — пацяшыцеляў; падарожнікі — спадарожнікаў; тыя, што на моры — стырнікаў; і ўсе мы — заўсёды прысутных памочнікаў і праваднікоў. Усхвалім блаславёных біскупаў і скажам: Сьвятыя настаўнікі, малітвамі вашымі сьпяшыце дапамагчы верным пазьбегнуць жыцьцёвых спакусаў, і выбавіць іх ад вечных мукаў.

Цяпер...

Заграем у трубы і запяём, бо вось Уладарка ўсіх, Маці і Дзева, глядзіць на нас і вянчае блаславеньнем тых, што славяць Яе. Хай зыдуцца ўладары і начальнікі і запяюць песьню хвалы Уладарцы, што нарадзіла Уладара, які захацеў у дабрыні сваёй і чалавекалюбстве вызваліць тых, што былі трыманыя пад уладаю сьмерці. Пастыры і настаўнікі, хваліце ўсячыстую Маці Добрага Пастыра, залаты сьвечнік, сьветлую хмару, больш прасторную за неба, адухоўлены ківот, вогненны пасад Уладара, залаты посуд з маннаю, зачыненую браму Слова, усіх хрысьціянаў прытулак. Усхвалім Яе боганатхнёнымі песьнямі і ўсклікнем: "Хорам Слова,

зрабі нас, пакорных, годнымі нябеснага валадарства, бо няма нічога немагчымага для Твайго заступніцтва."

## ЛІТУРГІЯ

**Трапар** *(тон 4)*. Роўныя апосталам і сусьветныя настаўнікі, Уладара ўсіх маліце, каб Ён дараваў супакой усяму сьвету і душам нашым багацьце свайго зьмілаваньня.

**Кандак** *(тон 2)*. Сьвятых і Богам натхнёных прапаведнікаў, вяршыні настаўнікаў, Ты, Госпадзе, узяў да сябе, даючы ім ў асалоду даброты Твае і супакой; высілкі і сьмерць іх Ты, Адзіны, які праслаўляеш сьвятых Тваіх, прыняў лепш за ўсе цэлапаленьні.

**Пракімен** *(Пс 18:5,2)*. Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

**Апостал:** Гэб 13:7-16

**Алілуя** *(Пс 88:6,8)*. Нябёсы славяць цуды Твае, Госпадзе, і вернасьць Тваю — хоры сьвятых.

Бог праслаўлены ў мностве сьвятых.

**Евангельле:** Мц 5:14-19

**Прычасьнік.** Усклікніце, праведныя, Госпаду ў радасьці: хвала пасуе праведным. Алілуя, алілуя, алілуя.

# АДПУШЧАЛЬНЫЯ ТРАПАРЫ БАГАРОДЗІЧНЫЯ ВАСЬМІ ТОНАЎ

**ТОН 1**

*У нядзелю вечарам:* Усё стварэньне цешыца, убачыўшы цуд над цудамі, які зьдзейсьніўся ў Табе, Поўная ласкі: Ты зачала бяз семя і нарадзіла Таго, на каго анельскія хоры ўзірацца ня сьмеюць. Малі Яго за душы нашыя.

*У панядзелак і сераду вечарам:* Поўная ласкі Багародзіца, Ты, не апёкшыся, зачала Боскі Агонь, і нарадзіла бяз семя Крыніцу жыцьця — Госпада. Збаўляй тых, што ўзьвялічваюць Цябе.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Маючы Цябе, Усячыстая, сваёй заступніцай, і вызваленыя Тваімі малітвамі ад цяжкіх бедаў, крыжом Сына Твайго ахоўваныя, Цябе, як належыць, пабожна ўзьвялічваем.

*У пятніцу вечарам:* Як толькі пачуўся голас Габрыеля, які казаў Табе, Дзева: "Радуйся!", Уладар усіх узяў цела ад Цябе, сьвятая Скарбніца, як прадказаў праведны Давід. Ты сталася больш прасторнай за неба, бо насіла ў сабе Творцу ўсяго. Слава Таму, хто пасяліўся ў Табе; слава Таму, хто выйшаў з Цябе; слава Таму, хто вызваліў нас нараджэньнем сваім."

**ТОН 2**

*У нядзелю вечарам:* Крыніца міласэрнасьці, Багародзіца, зрабі нас годнымі спагады Твае: глянь міласьціва на людзей, што зграшылі, і пакажы, як заўсёды, сілу Тваю, бо мы, на цябе спадзеючыся, "Радуйся!" усклікаем Табе, як некалі Габрыель, анёлаў начальнік.

*У панядзелак і сераду вечарам:* Дзякуючы Табе, Багародзіца Дзева, мы сталіся саўдзельнікамі Боскай існасьці, бо Ты нарадзіла нам Бога ў целе. Дзеля гэтага мы Цябе, як належыць, з пашанаю ўзьвялічваем.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Ты годная ўсякай хвалы, Багародзіца Дзева, мы славім Цябе: крыжом Сына Твайго пекла зруйнаванае было, сьмерць зьніштожаная, мы, памёрлыя, усталі і жыцьця ўдастоіліся, рай атрымалі — ранейшую асалоду. Дзеля гэтага, дзякуючы, славім Яго, як усяўладнага Хрыста Бога нашага і адзінага міласэрнага.

*У пятніцу вечарам:* Вышэй за розум ўсяслаўныя тайны Твае, Багародзіца: зьбярогшы чысьціню і захаваўшы дзявоцтва, Ты несумненна сталася Маці, нарадзіўшы Бога праўдзівага. Малі Яго за збаўленьне душаў нашых.

**ТОН 3**

*У нядзелю вечарам:* Красе дзявоцтва і сьветлай чысьціні Тваёй Багародзіца, Габрыель зьдзівіўся і ўсклікнуў: "Якую дастойную пахвалу прынясу Табе, як Цябе назаву? Ня ведаю і жахаюся і, як мне было загадана, клічу: "Радуйся, Поўная ласкі!"

*У панядзелак вечарам:* Прыстанішча і сіла нашая, Багародзіца, моцная памочніца сьвету ўсяму! Малітвамі Тваімі захавай слугаў Тваіх ад усякіх бедаў, адзіная Бласлаўлёная.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Мы прыдбалі сабе жазло сілы — крыж Сына Твайго, Багародзіца, і перамагаем ім варожае зухвальства, з любоўю ўзьвялічваючы Цябе.

*У сераду вечарам:* Прарокі прапаведавалі, апосталы навучалі, мучанікі вызнавалі, а мы ўверылі, што Ты сапраўды Багародзіца: дзеля гэтага ўзьвялічваем Тваё невыказнае сынараджэньне.

*У пятніцу вечарам:* Цябе, хадайніцу за збаўленьне наша, славім, Багародзіца Дзева, бо целам, якое Ён узяў ад Цябе, Сын Твой і Бог наш на крыжы пацярпеў і як Чалавекалюбец ад тленнасьці выбавіў нас.

**ТОН 4**

*У нядзелю вечарам:* Узгадаванай у сьвятыні, у сьвятым сьвятых, апранутай у веру, і мудрасьць, і веліч дзявоцтва арханёл Габрыель з неба прынёс прывітаньне, кажучы: "Радуйся Бласлаўлёная; радуйся, Усяслаўная: Госпад з Табою."

*У панядзелак вечарам:* Да Багародзіцы сёньня сьпешна пойдзем, грэшныя і пакорныя, і прыпадзем да Яе, каючыся і ўсклікаючы з глыбіні душы: "Уладарка нашая, памажы! Пакажы ласку Тваю, сьпяшайся, бо гінем у безьлічы правінаў. Не пакінь нас з нічым, бо Ты адзіная надзея нашая."

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Дзева беззаганная, Маці Хрыста Бога, меч прабіў Тваю найсьвятую душу, калі Ты бачыла дабравольна

расьпятага Сына і Бога Твайго. Не пераставай маліць Яго, Блаславёная, каб Ён даў нам адпушчэньне грахоў.

*У сераду вечарам*: Слова Айца — Хрыста Бога нашага, — ад Цябе ўцелаўлёнага мы пазналі, Багародзіца Дзева, адзіная чыстая, адзіная блаславёная. Дзеля гэтага Цябе няспынна ў песьнях славім.

*У пятніцу вечарам*: Тайна спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і, пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, уваскрасіў ім першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

**ТОН 5**

*У нядзелю вечарам:* З анёламі ў небе і з людзьмі на зямлі радасным голасам, Багародзіца, клічам: "Радуйся, брама больш прасторная за неба! Радуйся, адзінае збаўленьне тых, што на зямлі! Радуйся, Чыстая і Поўная ласкі, што нарадзіла Бога ў целе!"

*У панядзелак вечарам:* Хуткую абарону і дапамогу, і міласэрнасьць Тваю пакажы, Чыстая, слузе Твайму: суцішы марныя думкі і ўпаўшую душу маю падымі, Багародзіца, бо я ведаю, што можаш усё.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Крыжом Сына Твайго, Багародзіца ласкі поўная, ідальская мана была зьнішчаная і сіла дэманская пераможаная; дзеля гэтага мы, верныя, Цябе, як належыць, блаславяем і, вызнаючы Цябе Маці Божаю, дастойна ўзьвялічваем.

*У сераду вечарам:* Дзіўная і збавенная тайніца Дзевы аб'явілася сьвету, бо ад Яе нарадзіўся Ты бяз семя і паказаўся нятленным у целе: усіх радасьць, Госпадзе, слава Табе.

*У пятніцу вечарам:* Радуйся, брама Гасподняя непраходная! Радуйся, ахова і апякунка тых, што прыходзяць да Цябе! Радуйся, ціхае прыстанішча! Радуйся Ты, што без мужа нарадзіла ў целе Творцу і Бога Твайго! Не пераставай маліцца за тых, што славяць Народжанага ад Цябе і пакланяюцца Яму.

ТОН 6

*У нядзелю вечарам:* Пачаткам збаўленьня сталася для нас дабравешчаньне Габрыеля Дзеве: пачуўшы "Радуйся!" ад яго, Яна не адкінула прывітаньня і не ўсумнілася, як некалі Сара, але адказала: "Вось я служка Гасподняя, хай станецца са мною паводле слова твайго."

*У панядзелак вечарам:* Надзея сьвету, бласлаўлёная Багародзіца Дзева! Просім Твайго адзінага сільнага заступніцтва: зьмілуйся над людзьмі бездапаможнымі і малі міласэрнага Бога выбавіць душы нашыя ад усякай пагрозы, адзіная Бласлаўлёная.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Багародзіца Дзева, малі Сына Твайго, Хрыста Бога нашага, які дабравольна быў расьпяты на крыжы і выбавіў сьвет ад маны, каб Ён зьмілаваўся над душамі нашымі.

*У сераду вечарам:* Сьвятая Ўладарка, Чыстая Маці Бога нашага, што нарадзіла ў невыказны спосаб Тварца ўсіх, са сьвятымі апосталамі малі безустанку Ягоную дабрыню, каб вызваліў нас ад грэшных пажаданьняў і даў прабачэньне грахоў.

*У пятніцу вечарам:* Ты, што назваў Маці Тваю бласлаўлёнаю, аддаў сябе дабравольна на мукі і зазьзяў на крыжы, каб знайсьці Адама і кажучы анёлам: "Радуйцеся са мною, бо я знайшоў згубленую драхму." Божа, што ўсё мудра ўладкаваў, слава Табе!

ТОН 7

*У нядзелю вечарам*: Багародзіца, Дзева Чыстая! Разам з анёламі малі Сына Твайго, каб, перш чым прыйдзе канец, даў прабачэньне тым, што верна славяць Цябе.

*У панядзелак вечарам:* "Радуйся!" — кажам Табе, Багародзіца, бо Ты паказалася вышэйшай за анёлаў, нарадзіўшы Бога.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Расьпятага за нас Хрыста Бога, які зьнішчыў пекла ўладу, безупынна малі, Багародзіца Дзева, за збаўленьне душаў нашых.

*У сераду вечарам:* Спаўненьнем прарокаў і закону ёсьць плод улоньня Твайго, Усячыстая. Дзеля гэтага, ведаючы Цябе як Багародзіцу, славім і набожна ўзьвялічваем Цябе.

*У пятніцу вечарам:* Скарбніца нашага ўваскрасеньня, Усяхвальная, што, нарадзіўшы Збавіцеля, вызваліла падуладных граху, выратуй тых, што спадзяюцца на Цябе, з бяздоннай ямы правінаў — Ты, якая перад родамі была Дзеваю, і падчас родаў Дзеваю, і пасьля родаў засталася Дзеваю.

**ТОН 8**

*У нядзелю вечарам:* Радуйся, што праз анёла Радасьць сьвету прыняла! Радуйся, што нарадзіла Творцу Твайго і Госпада! Радуйся, што ўдастоілася стаць Маці Божаю!

*У панядзелак вечарам:* Непарушнае ўмацаваньне веры і пачэсны дар душ нашых, Багародзіцу ў песьнях, верныя, узьвялічым: "Радуйся, што ва ўлоньні Тваім зьмясьціла Камень Жыцьця! Радуйся, надзея ўсіх канцоў сьвету, сумных Заступніца! Радуйся, Дзева Маці!"

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Убачыўшы на крыжы расьпятага Цябе, Ягнё і Пастыра, і Збавіцеля сьвету, Маці Твая з плачам казала: "Сыне і Божа мой, сьвет радуецца, атрымаўшы вызваленьне, а сэрца маё гарыць, бачачы Тваё распяцьце, якое Ты церпіш за ўсіх."

*У сераду вечарам:* Духоўная брама жыцьця, Усячыстая Багародзіца! Вызваль ад бедаў верных, што прыбягаюць да Цябе, каб нам славіць Тваё сьвятое сынараджэньне для збаўленьня душаў нашых.

*У пятніцу вечарам:* Ты, што дзеля нас нарадзіўся ад Дзевы і на крыжы пацярпеў, сьмерцю зьнішчыўшы сьмерць і паказаўшыся Богам ва ўваскрасеньні, не пагардзі творамі рук Тваіх, пакажы чалавекалюбства Тваё, Міласэрны, прымі малітвы за нас Багародзіцы, якая нарадзіла Цябе, і збаў, Збавіцелю добры наш, людзей бездапаможных.